Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Мінскага Камітэтаў КП(б)Б

СТУДЗЕНЬ
10
1933 г.
№ 8 (4552)
Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

Сеньня у нумары:

Даклад тав. СТАЛІНА аб выніках першай пяцігодкі на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) (1, 2 і 3 стар.).

Загатаўляць ня менш 9.000 тон бульбы ў дзень (4 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Інтэрв'ю Чжан Сюэ-ляна прадстаўніком прэсы (4 стар.).

4 з паловаю тысячы настаўнікаў у Польшчы выкінуты на вуліцу за адзін год (4 стар.).

Ганебная старонка ў гісторыі румынскай замежнай палітыкі (4 стар.).

ВЫНІКІ ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДКІ

Даклад тав. СТАЛІНА на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) 7-га студзеня 1933 году

I. Міжнароднае значэньне пяцігодкі

Таварышы! Пры зьяўленьні ў сьвет пяцігадовага пляну паўрад ці меркавалі людзі, што пяцігодка можа мець вялізарнае міжнароднае значэньне. Наадварот, многія думалі, што пяцігодка ёсьць прыватная справа Савецкага саюзу, справа важная і сур'ёзная, але ўсё такі прыватная нацыянальная справа Савецкага саюзу.

Гісторыя, аднак, паказала, што міжнароднае значэньне пяцігодкі невымаральна. Гісторыя паказала, што пяцігодка зьяўляецца ня прыватнаю справаю Савецкага саюзу, а справаю ўсяго міжнароднага пралетарыяту. Яшчэ задоўга да зьяўленьня пяцігадовага пляну, у пэрыяд, калі мы канчалі барацьбу з інтэрвэнтамі і пераходзілі на рэйкі гаспадарчага будаўніцтва—яшчэ ў гэты пэрыяд Ленін гаварыў, што наша гаспадарчае будаўніцтва мае глыбокае міжнароднае значэньне, што кожны крок наперад савецкай улады па шляху гаспадарчага будаўніцтва сустракае глыбокі водгук у самых розпастайных пластох капіталістычных краін і расколвае людзей на два лягеры—прыхільнікаў пралетарскай рэвалюцыі і лягер не праціўнікаў.

Ленін гаварыў тады:

«Зараз галоўную сваю ўзьдзейнасьць на міжнародную рэвалюцыю мы аказваем сваёй гаспадарчай палітыкай. Усе на Савецкую Расійскую Рэспубліку глядзяць, усе працоўныя ва ўсіх краінах сьвету бяз усякага выключэньня і бяз усякага перапавялічэньня. Гэта дасягнута... на гэтай арэне барацьба перанесена ў сусьветным маштабе. Выраблым мы гэту задачу—і тады мы выйгралі ў міжнародным маштабе папаўна і канчаткова. Таму пытаньні гаспадарчага будаўніцтва набываюць для нас значэньне зусім выключнае. На гэтым фронце мы павінны атрымаць перамогу павольным, паступовым,—шпаркім нельга, — але паўхільным павышэньнем і рухам наперад» (Ленін. 3 выд., т. XXVI, стар. 410-411).

Гэта было сказана ў той пэрыяд, калі мы канчалі вайну з інтэрвэнтамі, калі ад ваеннай барацьбы з капіталізмам мы пераходзілі да барацьбы на гаспадарчым фронце, да пэрыяду гаспадарчага будаўніцтва.

З таго часу прайшло шмат год і кожны крок савецкай улады ў галіне гаспадарчага будаўніцтва, кожны год, кожны квартал бліскуча пацьвярджалі правільнасьць гэтых слоў тав. Леніна.

Але самае бліскучае пацьвярджэньне правільнасьці слоў Леніна даў пяцігадовы плян нашага будаўніцтва, узьнікненьне гэтага пляну, яго разьвіцьцё, яго ажыцьцяўленьне. Сапраўды, атаецца, ні адзін крок на шляху гаспадарчага будаўніцтва ў нашай краіне не сустракаў такога водгуку ў самых розпастайных пластох капіталістычных краін Эўропы, Амэрыкі, Азіі, як пытаньне аб пяцігадовым пляне, аб яго разьвіцьці, аб яго ажыцьцяўленьні.

У першыя часы пяцігадовы плян быў спатканы з боку буржуазіі і яе друку насьмешкай. «Фантазія», «брэд», «утопія» — так яны ахрысьцілі тады наш пяцігадовы плян. Потым, калі пачало выясьняцца, што ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну дае рэальныя рэзультаты, яны сталі біць у набат, сьцьвярджаючы, што пяцігадовы плян пагражае існаванню капіталістычных краін, што яго ажыцьцяўленьне прывядзе да запаўненьня эўрапэйскіх рынкаў тавараў, да ўзмацненьня дэмпінгу і паглыбленьня беспрацоўя. Потым, – калі і гэты трук, скарыстаны супроць савецкай улады, ня даў чаканых рэзультатаў—адкрылася сэрыя падарожжаў у СССР розных пралетарыяцкіх усякага роду фірм, органаў друку, таварыстваў розпага роду і г. д. з мэтай разьвеяць сваімі ўласнымі вачыма, —што-ж, уласна кажучы, робіцца ў СССР. Я не гавару тут аб рабочых дэлегацыях, якія з самага пачатку зьяўленьня пяцігадовага пляну выказвалі сваё захапленьне пачынаньнямі і посьпехам савецкай улады і праяўлялі сваю гатоўнасьць падтрымаць рабочую клясу СССР.

З гэтага часу і пачаўся раскол так званай грамадзкай думкі, буржуазнага друку, буржуазных таварыстваў усякага роду і г. д. Адны сьцьвярджалі, што пяцігадовы плян пацярпеў поўны крах і бальшавікі стаяць на краю пагібелі. Другія, наадварот, запэўнялі, што хоць бальшавікі дрэнныя людзі, з пяцігадовым пляном у іх усё-ж выходзіць справа і яны, як відаць, дабіваюцца сваёй мэты.

Магчыма ня лішнім будзе, калі я падам водгукі розпага роду органаў буржуазнага друку.

Возьмем, напрыклад, амэрыканскую газэту «Нью-Ёрк Таймс». У канцы лістапада 1932 году гэта газэта пісала:

«Пяцігадовы прамысловы плян, які паставіў сваёй мэтай зрабіць выклік панучыцьцю працоўных і які імкнецца да сваёй мэты «незалежна ад выпадкаў», як часта з гонарам пахвалялася Масква, не зьяўляецца ў сапраўднасьці пляном. Гэта—спэкуляцыя».

Выходзіць, што пяцігодка нават ня плян, а пустая спэкуляцыя. А вось водгук ангельскай буржуазнай газэты «Дэйлі тэлеграф», даны ў канцы лістапада 1932 году:

«Калі разглядаць плян, як пробны камень для «плянуючай эканомікі», то мы павінны сказаць, што ён пацярпеў поўны крах».

Водгук «Нью-Ёрк Таймс» у лістападзе 1932 году:

«Калектывізацыя гаспадаркі праваліла. Яна прывяла Расію на грань голаду».

Водгук буржуазнай газэты ў Польшчы «Газэта польска», даны летам 1932 году:

«Становішча паказвае як быццам, што ўрад Савецкаў зайшоў са сваёй палітыкай калектывізацыі вёскі ў тупік».

Водгук ангельскай буржуазнай газэты «Фінансыяль Таймс», даны ў лістападзе 1932 году:

«Сталін і яго партыя ў рэзультаце сваёй палітыкі аказваюцца перад тварам краху сыстэмы пяцігадовага пляну і правалу ўсіх задач, якія ён павішен быў ажыцьцявіць».

Водгук італьянскай часопісі «Палітыка»:

«Было-б недарэчнасьцю думаць, што чатыры гады работы народу, які складаецца са 160 мільёнаў чалавек, чатыры гады звычайнаважнага эканамічнага і палітычнага напружаньня з боку рэжыму такой сілы, якую прадстаўляе сабою бальшавіцкі рэжым, нічога не стварылі. Наадварот, яны стварылі нешт... І тым ня менш катастрофа ў наяўнасьці, яна зьяўляецца фактам бясспрэчным для ўсіх. У гэтым пераканаліся прыяцелі і ворагі, бальшавікі і антыбальшавікі, апазыцыянэры справа і зьлева».

Нарэшце, водгук амэрыканскай буржуазнай часопісі «Керрэнт гісторы»:

«Агляд цяперашняга становішча справы ў Расіі такім чынам вядзе да заключэньня, што пяцігадовая праграма правалілася як у адносінах абвешчаных мэтаў і яшчэ больш грунтоўна ў адносінах яе асноўных сацыяльных прынцыпаў».

Наўрад ці варта крытыкаваць аўтараў гэтых водгукаў. Я думаю, што ня варта, бо гэтым «цьвёрдалобым» людзі належаць да народу выкапняў сярэднявяковага пэрыяду, і як-бы не ажыцьцяўляўся ў нас пяцігадовы плян,—яны ўсё роўна будуць цьвердзіць сваё.

Пяройдзем да водгукаў іншых органаў друку, якія ідуць з таго-ж буржуазнага лягеру.

Вось водгук вядомай буржуазнай газэты ва Францыі «Тан», даны ў ступені 1932 году:

«СССР выйграў першы тур, індустрыялізуючыся без дапамогі чужаземнага капіталу».

Водгук тэй-жа «Тан», даны летам 1932 году:

«Камунізм гіганцкімі тэмпамі завяршае рэканструкцыю, у той час, як капіталістычны лад дазваляе рухацца толькі павольнымі крокамі... Ва Францыі, дзе зямельная ўласнасьць падзелена да бясконцасьці паміж паасобнымі ўласьнікамі, немагчыма мэханізаваць сельскую гаспадарку; саветы-ж, індустрыялізуючы сельскую гаспадарку, зводзілі выраблыць праблему ...У спаборніцтве з намі бальшавікі аказаліся пераможцамі».

Водгук ангельскай буржуазнай часопісі «Равиу Тэйбль»:

«Дасягненьні пяцігадовага пляну прадстаўляюць сабою зьдзіўляючае зьявішча. Трактарныя заводы Харкава і Сталінграду, аўтамабільны завод АМО ў Маскве, аўтамабільны завод у Н.-Ноўгарадзе, Дняпроўская гідра-электрычная станцыя, грандыёзныя сталяліцейныя заводы ў Магнітагорску і Кузьнецку, цэлая сетка машынабудаўнічых і хэмічных заводаў на Урале, які ператвараецца ў Савецкі Рур, усе гэтыя і іншыя прамысловыя дасягненьні ва ўсёй краіне, сьведчаць, што якавы-б ни былі труднасьці, савецкая прамысловасьць, як добра абводненая расьліна, расьце і ўмацоўваецца... Пяцігадовы плян залажыў асновы будучага разьвіцьця і надзвычайна ўзмоцніў магутнасьць СССР».

Водгук ангельскай буржуазнай газэты «Фінансыяль таймс»:

«Посьпехі, дасягнутыя ў машына-будаўнічай прамысловасьці, не падлягаюць ніякім сумненьням. Усхваленьні гэтых посьпехаў у друку і ў прамовах зусім не зьяўляюцца неўгрунтаванымі. Ня трэба забываць, што раней Расія выробляла толькі самыя простыя машыны і прылады. Праўда, і цяпер абсалютныя лічбы ўвозу машын і інструментаў павялічваюцца; але прапарцыянальная доля імпартаваных машын параўнальна з тымі, якія былі выроблены ў самым СССР, бязупынна зьмяншаецца. СССР цяпер выробляе ўсё абсталяваньне, неабходнае для сваёй мэталюргічнай і электрычнай прамысловасьці. Ён зводзе стварыць сваю ўласную аўтамабільную прамысловасьць. Ён стварыў вытворчасьць прылад і інструментаў, якая ахапляе ўсю гаму ад самых маленькіх інструментаў вялікай дакладнасьці і аж да найбольш цяжкіх прэсаў. Што-ж датычыць сельска-гаспадарчых машын, дык СССР ужо не залежыць ад увозу з-за граніцы.

Разам з тым, савецкі ўрад прымае меры да таго, каб спазьненьне ў прадукцыі вугалю і жалеза не перашкаджала ажыцьцяўленьню пяцігодкі за чатыры гады. Не падлягае сумненьню, што нова-набудаваныя вялізарныя заводы гарантуюць значны рост прадукцыі цяжкай прамысловасьці».

Водгук аўстрыйскай буржуазнай газэты «Нэйе фрэйе прэсэ», даны ў пачатку 1932 году:

«Бальшавізм можна праклінаць, але яго трэба ведаць, пяцігодка—гэта новы волат, які неабходна браць пад увагу і ва ўсякім выпадку ў гаспадарчы разьлік».

Водгук ангельскага капіталіста Гібсона Джарві, старшыні банку «Юнайтэд Дамініён», даны ў кастрычніку 1932 году:

«Я хачу растлумачыць, што я не камуніст, і не бальшавік, я—выразны капіталіст і індывідуаліст... Расія ідзе ўперад у той час, як заходта шмат нашых заводаў бязьдзейнічаюць і прыкладна тры мільёны нашага народу шукаюць у росначы работы. Пяцігодку высьмейвалі і прадракалі яе провал. Але вы можаце лічыць пясумненным, што ва ўмовах пяцігадовага пляну зроблена больш, чым намячалася...

Ва ўсіх прамысловых гарадох, якія я наведаў, узьнікаюць новыя раёны, пабудаваныя паводле пэўнага пляну, з шырокімі вуліцамі, упрыгожанымі дрэвамі і сквэрамі, з дамамі найбольш сучаснага тыпу,—школамі, больніцамі, рабочымі клюбамі і абавязкова дзіцячымі ясьлямі і дзіцячымі дамамі, дзе клапоцяцца аб дзецях, маткі якіх працуюць... Не прабуйце недаацэньваць рускіх пляноў і іх рабеце памылак, спадзяючыся, што савецкі ўрад можа праваліцца. Сёньняшняя Расія—краіна з душой і ідэалам. Расія—краіна дзівоснай актыўнасьці. Я веру, што імкненьні Расіі зьяўляюцца здаровымі... Быць можа самае важнае ў тым, што ўся моладзь і рабочыя ў Расіі маюць адну рэч, якой, на жаль, не хапае сёньня ў капіталістычных краінах, а іменна—надзею».

Водгук амэрыканскай буржуазнай часопісі «Нэйшэн», даны ў лістападзе 1932 году:

«Чатыры гады пяцігадовага пляну прынесьлі з сабой сапраўды **зьдзіўляючыя дасягненьні.** Савецкі саюз працаваў з інтэнсыўнасьцю ваеннага часу над творчай задачай пабудовы асноў новага жыцьця. **Тавар краіны зьмяняецца літаральна да непазнаванасьці...** Гэта правільна адносна Масквы з яе сотнямі запава асфальтаваных вуліц і сквэраў, новых будынкаў, з новымі прыгарадамі і кардонам новых фабрык на яе акраінах. Гэта правільна і ў адносінах менш значных гарадоў. Новыя гарады ўзьніклі ў стэпах і ў пустынях, не якія-небудзь некалькі гарадоў, а па меншай меры 50 гарадоў з насельніцтвам ад 50 да 250 тысяч чалавек. Усе яны ўзьніклі ў апошнія чатыры гады, кожны з іх зьяўляецца цэнтрам новага прадпрыемства або раду прадпрыемстваў, пабудаваных для распрацоўкі прыродных рэсурсаў.

Сотні новых раённых электрастанцый і цэлы рад гігантаў падобна Днепрабуду паступова ажыцьцяўляюць фармулу Леніна «сацыялізм ёсьць савецкая ўлада плюс электрыфікацыя...» Савецкі саюз арганізаваў масавы выраб бясконцага мноства прадметаў, якіх Расія ніколі раней не выробляла: трактараў, камбайнаў, высокаякасных сталяй, сынтэтычнага каўчука, шарыкападшыпнікаў, магутных дызэляў, турбін з 50.000 кілёват, тэлефоннага абсталяваньня, электрычных машын для горнай прамысловасьці, самалётаў, аўтамабіляў, валёсіпедаў і некалькіх соцень тыпаў новых машын...

Упершыню ў гісторыі Расіі здабываецца алюміній, магнэзыт, апатыты, ёд, платан і многія іншыя каштоўныя прадукты. **Шляхавёднымі пунктамі савецкіх раўнія не зьяўляюцца больш крыжы і купалы цэркваў, а збожжевыя элеватары і сіласныя вежы.** Калгасы будуюць дамы, хлявы, сьвінарнікі. Электрычнасьць праникае ў вёску, радыё і газэты заваявалі яе. Рабочыя гутаюць працаваць на паасобных машынах. Сялянскія хлапцы вырабляюць і абслугоўваюць сельска-гаспадарчыя машыны, якія больш і складаней, чым тое, што бачыла калі-небудзь Амэрыка. **Расія пачынае «мысьліць машынамі».** Расія шпарка пераходзіць ад веку дрэва да веку жалеза, сталі, бэтону і матораў».

Водгук «лева»-рэфармісцкай часопісі ў Англіі «Ферэард», даны ў верасьні 1932 году:

«Кіпіцца ў вочы вялізарная работа, якая адбываецца ў СССР. Новыя заводы, новыя школы, новыя кіно, новыя клюбы, новыя вялізарныя дамы—усюды новыя будоўлі. Многія з іх ужо скончаны, другія яшчэ акружаны рыштаваньнямі. Цяжка расказаць ангельскаму чытачу, што зроблена за апошнія два гады і што робіцца далей. Трэба ўсё гэта бачыць для таго, каб гэтаму паверыць. Нашы ўласныя дасягненьні, ажыцьцёўленыя намі за час вайны,—толькі глупства ў параўнаньні з тым, што робіцца ў СССР. Амэрыканцы прызнаюць, што нават у пэрыяд самай іхняй творчай гарачкі ў Заходніх штатах, там ня было нічога падобнага да цяперашняй ліхаманкавай творчай дзейнасьці ў СССР. За апошнія два гады ў СССР адбылося так шмат зьмен, што арамаўляешся далей прадстаўляць сабе, што-ж будзе ў гэтай краіне яшчэ праз дзесяць год... Выкіньце з галавы фантастычныя страшныя гісторыі, якія расказваюцца ангельскімі газэтамі і якія так упарта і так бязглузда хлусяць аб СССР. Выкіньце таксама з галавы ўсю тую палавінную праўду і ўражаньні, якія грунтуюцца на непаразуменні і якія пушчаны ў ход дылетанствуючымі інтэлігентамі, якія зьвеську глядзяць на СССР скрозь акуляры сярэдняй клясы, але якія ня маюць ні малейшага ўяўленьня аб тым, што адбываецца там... СССР будуе новае грамадзтва на здаровых падставах. Каб ажыцьцявіць гэту мэту, трэба рызыкаваць, трэба працаваць з энтузіязмам, з такой энэргіяй, якой сьвет да гэтага часу ня ведаў, трэба біцца з вялізарнымі труднасьцямі, немагчымымі пры імкненьні пабудаваць сацыялізм у неасяжнай краіне, ізаляванай ад рэшты сьвету.

Але, наведаўшы гэту краіну другі раз за два гады, я атрымаў уражаньне, што яна ідзе па шляху моцнага прагрэсу, плянуе, творыць і будуе і ўсё гэта ў такім маштабе, які зьдзіўляецца яркім выклікам на адрасу варожага капіталістычнага сьвету».

Такавы разгалосіца і раскол у лягеры буржуазных колаў, з якіх адны стаяць за зьнішчэньне СССР з яго нібы праваліўшымся пяцігадовым пляном, а другія, як кажуць, за тавэрыскае супрацоўніцтва з СССР, разьлічваючы, як відаць, на тое, што з посьпехаў пяцігадовага пляну можна будзе атрымаць для сябе некаторую выгоду. Асобна стаіць пытаньне аб адносінах рабочае клясы капіталістычных краін да пытаньня аб пяцігодцы, да пытаньня аб посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР. Можна было-б тут абмеркаваць падачаю водгуку адтай са шматлікіх рабочых дэлегацый, якія штогодна прыяжджаюць у СССР, хаця-б напрыклад, бальшэйскай рабочай дэлегацыі. Водгук гэты тыповы для ўсіх без выключэньня рабочых дэлегацый, усё роўна, ці ідзе гутарка аб ангельскай ці францускай дэлегацыі, аб германскай ці амэрыканскай, або аб дэлегацыях іншых краін. Вось ён:

«Мы захоплены тым вялізарным будаўніцтвам, якое мы пачыналі ў часе нашага наведжжа. У Маскве, як і ў Макеёўцы, Горлаўцы, Харкаве і Ленінградзе, мы маглі канстатаваць, з якім энтузіязмам там працуюць. **Усе машыны навейшай канструкцыі.** На заводах чыстата, шмат паветра і сьвятла. Мы бачылі, як у СССР рабочым аказваецца мэдыцынская і санітарная дапамога.

Рабочыя кватэры пабудаваны бліжа ад заводаў. У рабочых гарадох арганізаваны школы і ясьлі,—дзеці акружаны самымі пільнымі клопатамі. Мы маглі бачыць розьніцу паміж старымі і нова-пабудаванымі заводамі, паміж старымі і новымі кватэрамі. Усё, што мы бачылі, дало нам яснае ўяўленьне аб вялізарнай сіле працоўных, якая будуюць новае грамадзтва пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Мы наглядалі ў СССР вялікі культурны ўздым, у той час, як у іншых краінах пануе запэпад ва ўсіх галінах, пануе беспрацоўе. Мы маглі бачыць, якія страшныя труднасьці савецкія працоўныя сустракаюць на сваім шляху. Мы тым у большай ступені разумеем гонар, з якім яны паказваюць нам свае перамогі. Мы пераконаны, што яны перамогуць усе перашкоды».

Вось вам міжнароднае значэньне пяцігодкі. Варта было нам прарабіць будаўнічую работу на працягу якіх-небудзь 2—3 год, варта было паказаць першыя посьпехі пяцігодкі, каб увесь сьвет раскалоўся на два лягеры—на лягер людзей, якія брэшуць на нас бяз стомы, і лягер людзей, якія зьдзіўлены посьпехамі пяцігодкі, не гаворачы ўжо аб тым, што ёсьць і ўзмацняецца наш уласны лягер ва ўсім сьвеце—лягер рабочае клясы капіталістычных краін, які радуецца посьпехам рабочае клясы СССР і гатовы аказаць ёй пантрыманьне на страх буржуазіі ўсяго сьвету.

Што гэта значыць?

Гэта значыць, што міжнароднае значэньне пяцігодкі, міжнароднае значэньне яе посьпехаў і заваяваньняў не падлягае сумненьню. Гэта значыць, што капіталістычныя краіны чуваць пралетарскай рэвалюцыяй і іменна таму, што яны чуваць пралетарскай рэвалюцыяй, буржуазія хацела-б пачарпнуць у няўдачах пяцігодкі новы аргумант супроць рэвалюцыі і, наадварот, пралетарыят стараецца пачарпнуць і сапраўды чэрпае ў посьпехах пяцігодкі новы аргумант за рэвалюцыю супроць буржуазіі ўсяго сьвету.

Посьпехі пяцігодкі мабілізуюць рэвалюцыйныя сілы рабочае клясы ўсіх краін супроць капіталізму,—такі бясспрэчны факт.

Ня можа быць сумненьня, што міжнароднае рэвалюцыйнае значэньне пяцігодкі сапраўды невымаральна. Тым з большай увагай павінны мы адносіцца да пытаньня аб пяцігодцы, аб зьмесьце пяцігодкі, аб асноўных задачах пяцігодкі. Тым з большай старэннасьцю мы павінны прааналізаваць вынікі пяцігодкі, вынікі выкананьня і ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну.

II. Асноўная задача пяцігадовага пляну і шлях яе ажыцьцяўленьня

Пяройдзем да пытаньня аб пяцігадовым пляне па сутнасьці. Што такое пяцігадовы плян? У чым заключалася асноўная задача пяцігадовага пляну?

Асноўная задача пяцігодкі заключалася ў тым, каб перавесьці нашу краіну з яе адсталай часамі сярэднявяковай тэхнікай на рэйкі новай сучаснай тэхнікі.

Асноўная задача пяцігодкі заключалася ў тым, каб ператварыць СССР з краіны аграрнай і немачнай, залежнай ад капрызаў капіталістычных краін,—у краіну індустрыяльную і магутную, зусім самастойную і незалежную ад капрызаў сусьветнага капіталізму.

Асноўная задача пяцігодкі заключалася ў тым, каб, ператвараючы СССР у краіну індустрыяльную, — выцясьніць да канца капіталістычныя элемэнты, распырыць фронт сацыялістычных форм гаспадаркі і стварыць эканамічную базу для зьнішчэньня клясаў у СССР, для пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Асноўная задача пяцігодкі заключалася ў тым, каб стварыць у нашай краіне такую індустрыю, якая была-б здольна пераўтвараць і рэарганізаваць ня толькі прамысловасьць у цэлым, але і транспарт, але і сельскую гаспадарку на базе сацыялізму.

Асноўная задача пяцігодкі заключалася ў тым, каб перавесьці дробную і раздробленую сельскую гаспадарку на рэйкі буйной калектыўнай гаспадаркі, забясьпечыць тым самым эканамічную базу сацыялізму ў вёсцы і ліквідаваць такім чынам магчымасьць адваўленьня капіталізму ў СССР.

Нарэшце, задача пяцігадовага пляну заключалася ў тым, каб стварыць у краіне ўсе неабходныя тэхнічныя і эканамічныя прадпасылкі для максымальнага ўзьнясьцця абароназдольнасьці краіны, якая дае магчымасьць арганізаваць рашучы адпор усім і ўсякім спробам ваеннай інтэрвэнцыі звонку, усім і ўсякім спробам ваеннага нападу звонку.

Чым дыктавалася гэта асноўная задача пяцігодкі, чым яна ўгрунтоўвалася?

Неабходнасьцю ліквідацыі тэхніка-эканамічнай адсталасьці Савецкага саюзу, якая асуджае яго на незавіднае існаваньне, неабходнасьцю стварыць у краіне такія прадпасылкі, якія-б далі ёй магчымасьць на тылы дагнаць, але з часам і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны.

Меркаваньнем аб тым, што савецкая ўлада ня можа доўга трымацца на базе ад сталай прамысловасьці, што толькі сучасная буйная прамысловасьць, якая ня толькі ня ўступае, але можа з часам перавысіць прамысловасьць капіталістычных краін,—можа слукыць сапраўдным і надзейным фундамантам для савецкай улады.

Меркаваньнем аб тым, што савецкая ўлада ня можа доўга базавацца на дзьвюх процілеглых асновах—на буйнай сацыялістычнай прамысловасьці, якая **зьнічае** капіталістычныя элемэнты, і на дробнай адзіаасобнай сялянскай гаспадарцы, якая **параджае** капіталістычныя элемэнты.

Меркаваньнем аб тым, што пакуль не надвесьцена пад дробную сялянскую гаспадарку база буйной вытворчасьці, пакуль не абгрунтаны дробныя сялянскія гаспадаркі ў буйныя калектыўныя гаспадаркі,—небясьпека адваўленьня капіталізму ў СССР зьяўляецца самай рэальнай небясьпекай з усіх магчымых небясьпек.

Ленін гаварыў:

«Рэвалюцыя зрабіла тое, што за некалькі месяцаў Расія па сваім **палітычным** ладзе дагнала перадавыя краіны. Але гэтага мала. Вайна вяўмольна, яна ставіць пытаньне з бязьлітаснай рэзкасьцю: або загінуць, або дагнаць перадавыя краіны і перагнаць іх таксама і **эканамічна...** Або зэтінуць або на ўсіх парах імкнуцца ўперад. Так пастаўлена пытаньне гісторыяй» (Ленін, 3-е выданьне, т. XXI, стар. 191).

Ленін гаварыў:

«Пакуль мы жывем у дробна-сялянскай краіне, для капіталізму ў Расіі ёсьць больш моцная эканамічная база, чым для камунізму. Гэта неабходна запамятаць. Кожны, хто ўважліва наглядаў за жыцьцём вёскі ў параўнаньні з жыцьцём гораду, ведае, што мы вырэньняў капіталізму ня вырвалі і фундамант, аснову ва ўнутранога ворага не падарвалі. Апошні трымаецца па дробнай гаспадарцы і, каб падарваць яе, ёсьць адзін сродак—перавесьці гаспадарку краіны, у тым ліку і земляробства, на новую тэхнічную базу, на тэхнічную базу сучаснай буйной вытворчасьці... Толькі тады, калі краіна будзе электрыфікавана, калі пад прамысловасьць, сельскую гаспадарку і транспарт будзе падведзена тэхнічная база сучаснай буйной прамысловасьці, толькі тады мы пераможам канчаткова». (Ленін, 3-е выд. т. XXVI, стар. 46-47).

Гэтыя палажэньні і леглі ў аснову тых меркаваньняў партыі, якія прывялі да выпрацоўкі пяцігадовага пляну, якія прывялі да вызначэньня асноўнай задачы пяцігадовага пляну.

Так стаіць справа з асноўнай задачай пяцігодкі.

Але ажыцьцяўленьне такога грандыёзнага пляну нельга пачынаць утоесіці, з чаго пачала. Каб ажыцьцявіць такі плян, трэба перш за ўсё знайсьці асноўнае зьвяно ланцуга, бо толькі знайшоўшы асноўнае зьвяно і ўхапіўшыся за яго, можна было выцягнуць усе іншыя зьвеньні пляну.

У чым заключалася асноўнае зьвяно пяцігадовага пляну?

Асноўнае зьвяно пяцігадовага пляну заключалася ў цяжкай прамысловасьці з яе сэрцавінай—машынабудаўніцтвам. Бо толькі цяжкая прамысловасьць здольна рэканструяваць і пастаўіць на ногі і прамысловасьць у цэлым, і транспарт, і сельскую гаспадарку. З яе і трэба было пачаць ажыцьцяўленьне пяцігодкі. Значыць, адбудаваньне цяжкай прамысловасьці трэба было пакласьці ў аснову ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну.

Мы маем указаньні Леніна і на гэты прадмет:

«Выратаваньнем для Расіі зьяўляецца ня толькі добры ўраджай у сялянскай гаспадарцы,—гэтага яшчэ мала,—і ня толькі добры стан лёгкай прамысловасьці, што пастаўляе сялянству прадметы спажываньня,—гэтага таксама яшчэ мала, нам неабходна таксама **цяжкая** індустрыя... Без выратаваньня цяжкай прамысловасьці, без яе адбудаваньня мы ня зможам пабудаваць ніякай прамысловасьці, без яе мы наогул загінем, як самастойная краіна... Цяжкая індустрыя патрабуе дзяржаўных субсыдый. Калі мы іх ня знойдзем, то мы, як цывілізаваная дзяржава—я ўжо не гавару, як сацыялістычная—загінулі». (Ленін, 3-е выд т. XXVII, стар. 349).

Але адбудаваньне і разьвіцьцё цяжкай індустрыі, асабліва ў такой адсталай і небагатай краіне, якой была наша краіна ў пачатку пяцігодкі, зьяўляецца самай цяжкай справай, бо цяжкая індустрыя патрабуе, як вядома, вялізарных капіталавых затрат і наяўнасьці пэўнага мінімуму вопытных тэхнічных сіл, без чаго, наогул кажучы, немагчыма адбудаваньне цяжкай індустрыі.

Ці ведала аб гэтым партыя і ці ўяўляла сабе гэта? Так, ведала. І ня толькі ведала, але заяўляла аб гэтым голасна. Партыя ведала якім шляхам была пабудавана цяжкая індустрыя ў Англіі, Германіі, Амэрыцы. Яна ведала, што цяжкая індустрыя была пабудавана ў гэтых краінах або пры дапамозе буйных пазык, або шляхам ограбленьня іншых краін, або і тым і іншым шляхам адначасова. Партыя ведала, што гэтыя шляхі закрыты для нашай краіны.

(Працяг на 2 стар.)

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ВЫНІКІ ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДКІ

Даклад тав. СТАЛІНА на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦККК УсеКП(б) 7-га студзеня 1933 году

На што-ж яна разлічвала? Яна разлічвала на ўласныя сілы нашай краіны, яна разлічвала на тое, што, маючы савецкую ўладу і апіраючыся на нацыяналізацыю зямлі, прамысловасьці, транспарту, банкаў, гандлю, мы москам праводзіць найстражэйшы рэжым эканоміі для таго, каб накапляць патрэбныя сродкі, неабходныя для абдумаванага і разьвіцьця цяжкай індустрыі. Партыя проста гаварыла, што гэта справа патрабуе сур'ёзных ахвяр і што мы павінны найсьці на гэтыя ахвяры адкрыта і сьмяцоока, калі хочам дабіцца мэты. Партыя разьлічвала ўзьняць гэту справу ўнутранымі сіламі нашай краіны без кабальных крэдытаў і пазык звонку. Вось што гаварыў Ленін наконт гэтага:

«Мы павінны пастарацца пабудаваць дзяржаву, у якой рабочыя захавалі-б сваё кіраўніцтва над сялянамі, давер'е сялян у адносінах да сябе, і з найвялікшай эканоміяй выгналі-б са сваіх грамадзкіх адносін усялякія сьляды якіх-бы там ні было зьляшаскіраў. Мы павінны зьвесьці наш дзяржаўны апарат да максымальнай эканоміі. Мы павінны выкінуць з яго ўсё лішняе, чаго ў ім засталося так многа ад царскай Расіі, ад яе бюракратычна-капіталістычнага апарату. Ці ня будзе гэта царствам сялянскай абмежаванасьці? Не. Калі мы захаваем за рабочай клясай кіраўніцтва над сялянствам, то мы атрымаем магчымасьць ланой найвялікшай і найвялікшай эканоміі гаспадаркі ў нашай дзяржаве дабіцца таго, каб усякае малейшае зьбераганьне закавець для разьвіцьця нашай буйнай машыннай індустрыі, для разьвіцьця электрыфікацыі, гідраторфу, для дабудовы Волхаўбуду і інш. У гэтым і толькі ў гэтым будзе наша надзея. Толькі тады мы будзем у стане перасесьці, кажучы фігуральна, з адтаго каня на другога. Іменна з каня сялянскага, мужыцкага, зьбяднелага, з каня эканоміі, разьлічаных на зруйнаваную сялянскую краіну,—на каня, якога шукае і ня можа ня шукаць для сябе пралетарыят, на каня буйнай машыннай індустрыі, электрыфікацыі, Волхаўбуду і г. д.» (Ленін, 3-е выд. т. XXVII, стар. 417).

Перасесьці са зьбяднелага мужыцкага каня на каня буйнай машыннай індустрыі, вось якую мэту мела партыя, выпрацоўваючы пяцігадовы плян і дабіваючыся яго ажыцьцяўленьня. Устанавіць самы строгі рэжым эканоміі і накапляць сродкі, патрэбныя для фінансаваньня індустрыялізацыі нашай краіны—вось на якіх шляхах трэба было стаць, каб дабіцца адбудаваньня цяжкай індустрыі і ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну.

Сьмелая задача? Цяжкі шлях? Але наша партыя таму і завецца ленінскай партыяй, што яна ня мае права баяцца труднасьцяй.

Больш таго, упэўненасьць партыі ў ажыцьцяўленьні пяцігодкі і вера ў сілы рабочай клясы былі да таго моцнымі, што партыя знайшла магчымым паставіць сабе задачу ажыцьцявіць гэту цяжкую справу не за пяць год, як гэтага патрабаваў пяцігадовы плян, а за чатыры гады, уласна, за чатыры гады і тры месяцы, калі дадаць асобны квартал.

На гэтай аснове і нарадзіўся выдатны лёзунг: «Пяцігодка—за чатыры гады».

І што-ж?

Факты потым паказалі, што партыя мела рацыю.

Факты паказалі, што без гэтай сьмелась ці і веры ў сілы рабочай клясы партыя не магла-б дабіцца тэй перамогі, якою ганарыцца мы цяпер на праву.

III. Вынікі пяцігодкі за чатыры гады ў галіне прамысловасьці

Пяройдзем цяпер да пытаньня аб выніках ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну.

Якавы вынікі пяцігодкі за чатыры гады ў галіне **прамысловасьці?** Ці дабіліся мы перамогі ў гэтай галіне? Так, дабіліся. І яны толькі дабіліся, а зрабілі больш, чым мы самі чакалі, чым маглі чакаць самыя гарачыя галовы ў нашай партыі. Гэтага не адмаўляюць цяпер нават ворагі. Тым больш ня могуць гэтага адмаўляць нашы крыўдзіцелі.

У нас ня было чорнай металюргіі—асновы індустрыялізацыі краіны. У нас яна ёсьць цяпер.

У нас ня было трактарнай прамысловасьці. У нас яна ёсьць цяпер.

У нас ня было аўтамабільнай прамысловасьці. У нас яна ёсьць цяпер.

У нас ня было варштатабудаўніцтва. У нас яно ёсьць цяпер.

У нас ня было сур'ёзнай і сучаснай хімічнай прамысловасьці. У нас яна ёсьць цяпер.

У нас ня было сапраўднай і сур'ёзнай прамысловасьці па вырабу сучасных сельска-гаспадарчых машын. У нас яна ёсьць цяпер.

У нас ня было авіяцыйнай прамысловасьці. У нас яна ёсьць цяпер.

У сэнсе выпрацоўкі электрычнай энэргіі мы стаялі на самым апошнім месцы. Цяпер мы выйшлі на адно з першых месц.

У сэнсе здабываньня нафтавых прадуктаў і вугалю мы стаялі на апошнім месцы. Цяпер мы выйшлі на адно з першых месц.

У нас была толькі адна адзіная вугольна-металюргічная база на Украіне, з якою мы ледзь спраўляліся. Мы дабіліся таго, што ня толькі подняли гэту базу, але стварылі яшчэ новую вугольна-мэталюргічную базу на Ўсходзе, якая зьяўляецца гонарам нашай краіны.

Мы мелі толькі адну адзіную базу тэкстыльнай прамысловасьці на Поўначы нашай краіны. Мы дабіліся таго, што будзем мець у бліжэйшы час дзьве новыя базы тэкстыльнай прамысловасьці ў Сярэдняй Азіі і Ўсходняй Сібіры.

І мы ня толькі стварылі гэтыя новыя вялізарныя галіны прамысловасьці, але мы іх стварылі ў такім маштабе і ў такіх памерах, перад якімі блякнуць маштабы і памеры эўрапэйскай індустрыі.

А ўсё гэта прывяло да таго, што капіталістычныя элемэнты выдасьлены з прамысловасьці канчаткова і беспаваротна, а сацыялістычная прамысловасьць стала адзінай формай індустрыі ў СССР.

А ўсё гэта прывяло да таго, што краіна наша з аграрнай стала індустрыяльнай, бо ўдзельная вага прамысловай прадукцыі ў адносінах сельска-гаспадарчай узвялася з 48 проц. у пачатку пяцігодкі (1928 г.) да 70 проц. пад канец чацьвертага году пяцігодкі (1932 г.).

А ўсё гэта прывяло да таго, што пад канец чацьвертага году пяцігодкі нам удалося выканаць праграму агульнай прамысловай вытворчасьці, разлічаную на пяць год, на 93.7 проц., узьняўшы аб'ём прамысловай прадукцыі больш, чым у тры разы параўнальна з даваенным узроўнем і больш чым у два разы параўнальна з узроўнем 1928 г. Што-ж датычыць праграмы вытворчасьці па цяжкай прамысловасьці, то мы выканалі пяцігадовы плян на 108 проц. Праўда, мы тут недавыканалі агульную праграму пяцігодкі на 6 проц. Але гэта тлумачыцца тым, што, з прычыны агрэсіўнасьці суседніх краін капіталізму з намі пакты аб ненападзе і ўскладненьняў на Далёкім Усходзе нам прыйшлося насьпех пераключыць рад заводаў у мэтах узмацненьня абароны на выраб сучасных прылад абароны. Ну а пераключэньне гэта, з прычыны неабходнасьці крайсьці векаторы падрыхтоўкі пэрыяд, трывае да таго, што заводы гэтыя спынілі ці выраб прадукцыі на працягу чатырох месяцаў, што не магло не адбіцца на выкананьні агульнай праграмы вытворчасьці па пяцігадовому пляну на працягу 1932 году. Апэрацыя гэта прывяла да таго, што мы попоўнілі палкам і поўнасьцю прабелы ў справе абароназдольнасьці краіны. Але яна не магла не адбіцца адмоўна на выкананьні праграмы вытворчасьці па пяцігадовому пляну. Ня можа быць ніякага сумненьня, што без гэтай прыўвахоцізчай акалічнасьці мы ня толькі выканалі-б, але напоўна перавыканалі-б лічбовую частку пяцігадовага пляну.

Нарэшце, усё гэта прывяло да таго, што з краіны слабай і непадрыхтаванай да абароны Савецкі саюз ператварыўся ў краіну магутную ў сэнсе абароназдольнасьці, у краіну, гатовую да ўсякіх выпадковасьцяй, у краіну, здольную вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя прылады абароны і забясьпечыць імі сваю армію ў выпадку нападу звонку.

Такавы ў агульным выніку пяцігодкі за чатыры гады ў галіне прамысловасьці. Цяпер мяркуйце самі: чаго варта пасьля ўсяго гэтага балбатня буржуазнай прэсы аб «праваале» пяцігодкі ў галіне прамысловасьці.

А як стаіць справа з капіталістычнымі краінамі, якія перажываюць зараз жорсткі крызіс у сэнсе росту іх прамысловай прадукцыі? Вось усім вядомыя афіцыяльныя даныя. У той час, як аб'ём прамысловай прадукцыі СССР пад канец 1932 году вырас у параўнаньні з даваенным узроўнем да 334 проц., аб'ём прамысловай прадукцыі ПАЗШ знізіўся за той-жа пэрыяд да 84 проц. даваеннага ўзроўню, Англіі—да 75 проц., Германіі—да 62 проц.

У той час, як аб'ём прамысловай прадукцыі СССР вырас пад канец 1932 году ў параўнаньні з узроўнем 1928 году да 219 проц., аб'ём прамысловай прадукцыі ПАЗШ знізіўся за той-жа пэрыяд да 56 проц., Англіі—да 80 проц., Германіі — да 65 проц., Польшчы—да 54 проц. Аб чым гавораць гэтыя даныя, як не аб тым, што капіталістычная сыстэма прамысловасьці ня вытрымала экзамэну ў цяжкае з савецкай сыстэмай, што савецкая сыстэма прамысловасьці мае ўсе перавагі перад сыстэмай капіталістычнай. Нам гавораць, што ўсё гэта добра, што пабудавана шмат новых заводаў, закладзены асновы індустрыялізацыі. Але было-б значна лепш адмовіцца ад палітыкі індустрыялізацыі, ад палітыкі нашырэньня вырабу сродкаў вытворчасьці, або прынамсі адкласьці гэту справу на зачні плян з тым, каб выраблядь больш паркалю, абутку, вопраткі і інш. прадметаў шырокага ўжытку. Прадметаў шырокага ўжытку вырабляецца менш, чым трэба, а гэта стварае пэўныя затрудненьні. Але тады трэба ведаць і трэба ўявіць сабе, да чаго прывяла-б нас падобная палітыка адсоўваньня на задні плян задач індустрыялізацыі. Зразумела, мы маглі-б з пагтара мільярдаў рублёў валюты, патрачаных за гэты пэрыяд на абсталяваньне нашай цяжкай прамысловасьці, адкласьці палову на імпарт базоўны, скуры, воўны, каўчука і г. д. У нас тады было-б больш паркалю, абутку, вопраткі. Але ў нас ня было-б тады ні трактарнай, ні аўтамабільнай прамысловасьці, ня было-б больш-небудзь сур'ёзнай чорнай металюргіі, ня было-б магчыма для вырабу машын,—і мы былі-б безабаронными перад тварам узброенага новай тэхнікай капіталістычнага акружэньня.

Мы пазбавілі-б тады сябе магчымасьці забясьпечваць сельскую гаспадарку трактарамі і сельгасмашынамі,—стала быць, мы страцілі-б бяз хлеба. Мы пазбавілі-б сябе магчымасьці атрымаць перамогу над капіталістычнымі элемэнтамі ў краіне,—стала быць мы пазбавілі-б шансы на рэстаўрацыю капіталізму. Мы ня мелі-б тады ўсіх сучасных сродкаў абароны, без якіх немагчыма дзяржаўная незалежнасьць краіны, без якіх краіне пераўтварацца ў аб'ект ваеншых апэрацый замежных ворагаў. Наша становішча было-б тады больш ці менш аналёгічна становішчу цяперашняга Кітаю, які ня мае сваёй цяжкай прамысловасьці, ня мае сваёй ваеннай прамысловасьці і які кіруюць усе, каму толькі не лянота. Адным словам, мы мелі-б у такім выпадку ваенную інтэрэсэнцыю, ня кажучы аб ненападзе, а вайну, вайну небяспечную і сьмяротную, вайну крывавую і вярэдную, бо ў гэтай вайне мы былі-б амаль што бязбройнымі перад ворагамі, якія маюць у сваім распараджэньні ўсе сучасныя сродкі нападу.

Вось як абарочваецца справа, таварышы.

Ясна, што паважаючая сябе дзяржаўная ўлада, паважаючая сябе партыя не магла стаць на такі пагібельны пункт гледжаньня. І іменна таму, што партыя адкінула такую антырэвалюцыйную ўстаноўку, імен на таму яна дабілася рашаючай перамогі ў справе выкананьня пяцігадовага пляну ў галіне прамысловасьці. Ажыцьцяўляючы пяцігодку і арганізуючы перамогу ў галіне прамысловага будаўніцтва, партыя праводзіла палітыку найбольш паскораных тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці. Партыя, як-бы падхлёствала краіну, пасакараючы яе бег уперад. Ці правільна рабіла партыя, праводзячы палітыку найбольш паскораных тэмпаў? Так, бязумоўна правільна.

Нельга не пазнаваць краіну, якая адстала на сто год і якой напружае з-за яе адсталасьці сьмяротная небясьпека. Толькі такім чынам можна было даць краіне магчымасьць пасьпех пераўзбройцца на базе новай тэхнікі і выйсьці, нарэшце, на шырокую дарогу. Далей, мы не маглі ведаць, у які дзень нападуць на СССР імпэрыялісты і перапыняць наша будаўніцтва. А што яны маглі напасьці ў любы момант, карыстаючыся тэхніка-эканамічнай слабасьцю нашай краіны,—у гэтым не магло быць сумненьня.

Таму партыя была прымушана падхлёстваць краіну, каб ня ўпусьціць часу скарыстаць да дна перадышку і пасьпець сварыць у СССР асновы індустрыялізацыі, якія прадстаўляюць базу яго магутнасьці. Партыя ня мела магчымасьці чакаць і маноўраваць, яна павінна была праводзіць палітыку найбольш паскораных тэмпаў.

Нарэшце, партыя павінна была пакончыць у магчыма кароткі тэрмін са слабасьцю краіны ў галіне абароны. Умовы моманту, рост узбраеньняў у капіталістычных краінах, правал ідэі разбраеньня, нянавісьць міжнародняй буржуазіі да СССР,—усё гэта штурхала партыю на тое, каб фарсаваць справу ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны, асновы яе незалежнасьці.

Але ці мела партыя рэальную магчымасьць ажыцьцяўляць палітыку найбольш паскораных тэмпаў? Так, мела. Яна мела гэту магчымасьць ня толькі таму, што яна пасьпела своячасова раскачаць краіну ў духу шпаркага прасоўваньня ўперад, але перш за ўсё таму, што яна магла абапірацца ў справе шырокага новага будаўніцтва на старыя або абноўленыя заводы і фабрыкі, якія былі ўжо асвоены рабочымі і інжынэрна-тэхнічным персаналам і якія давалі, з прычыны гэтага, магчымасьць ажыцьцяўляць найбольш паскораныя тэмпы разьвіцьця.

Вось на якой аснове вырасьлі ў нас у пэрыяд першай пяцігодкі шпаркі ўдым новага будаўніцтва, пафас разгорнутага будаўніцтва, героі і ўдарнікі новабудоўлаў, практыка бурных тэмпаў разьлічныя.

Ці можна сказаць, што ў другой пяцігодцы прыдзецца праводзіць такую-ж дакладна палітыку найбольш паскораных тэмпаў?

Не, нельга гэтага сказаць.

Па-першае, у выніку пасьпяховага выкананьня пяцігодкі мы **ўжо выканалі ў** асноўным яе галоўную задачу—падвядрень не базы новай сучаснай тэхнікі пад прамысловасьць, транспарт, сельскую гаспадарку. Ці варта пасьля гэтага падхлёстваць і падганяць краіну? Ясна, што няма ў гэтым цяпер неабходнасьці.

Па-другое, у выніку пасьпяховага выкананьня пяцігодкі нам удалося ўжо падняць абароназдольнасьць краіны на належную вышыню. Ці варта пасьля гэтага падхлёстваць і падганяць краіну? Ясна, што цяпер у гэтым няма патрэбы.

Нарэшце, у выніку пасьпяховага выкананьня пяцігодкі нам удалося пабудаваць дзесяткі і сотні новых вялікіх заводаў і камбінатаў, якія маюць новую складаную тэхніку. Гэта азначае, што ў аб'ёме прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы асноўную ролю будуць адыгрываць ужо не старыя заводы, тэхніка якіх ужо асвоена, як гэта мела месца ў пэрыяд першай пяцігодкі, а новыя заводы, тэхніка якіх яшчэ не асвоена і якую трэба асвоіць. Але асваеньне новых прадпрыемстваў і новай тэхнікі прадстаўляе значна больш труднасьцяй, чым скарыстаньне старых або абноўленых заводаў і фабрык, тэхніка якіх ужо асвоена. Яно патрабуе больш часу для таго, каб падняць кваліфікацыю рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу і набыць новыя навыкі для поўнага скарыстаньня новай тэхнікі. Ці ня ясна, пасьля ўсяго гэтага, што калі-б мы нават і хацелі, мы не маглі-б ажыцьцявіць у пэрыяд другой пяцігодкі, асабліва ў першыя два гады другой пяцігодкі, палітыку найбольш паскораных тэмпаў разьвіцьця.

Вось чаму я думаю, што для другой пяцігодкі нам прыдзецца ўзяць менш паскораныя тэмпы росту прамысловай прадукцыі. У пэрыяд першай пяцігодкі штогодны прырост прамысловай прадукцыі складаў у сярэднім 22 проц. Я думаю, што для другой пяцігодкі прыдзецца ўзяць 13-14 проц. штогоднага прыросту прамысловай прадукцыі ў сярэднім. Для капіталістычных краін такі тэмп прыросту прамысловай прадукцыі зьдзяйсьнецца недасяжным ідэалам. І ня толькі такі тэмп прыросту прамысловай прадукцыі, нават 5 проц. штогоднага сярэдняга прыросту, складае для іх цяпер недасяжны ідэал. Але на тое яны і капіталістычныя краіны. Іншая справа савецкая краіна з савецкай сыстэмай гаспадаркі. Пры нашай сыстэме гаспадаркі мы маем поўную магчымасьць і мы павінны ажыцьцявіць 13-14 проц. штогоднага прыросту прадукцыі, як **мінімум.**

У пэрыяд першай пяцігодкі мы здолелі арганізаваць энтузіязм, пафас **новага будаўніцтва** і дабіліся рашаючых посьпехаў. Гэта вельмі добра. Але цяпер гэтага мала. Цяпер гэту справу мы павінны даводзіць энтузіязмам, пафасам **асаблівага** новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным узьнімцем прадукцыйнасьці працы, сур'ёзным скарачэньнем сабекошту. **У гэтым цяпер галоўнае.** Бо толькі на гэтай базе мы можам дабіцца, скажам, да другой палавы другой пяцігодкі новага магутнага разьбегу як у галіне будаўніцтва, так і ў галіне прыросту прамысловай прадукцыі.

Нарэшце, некалькі слоў аб самых тэмпах і процантах штогоднага прыросту прадукцыі. Нашы прамыслоўцы мала займаюцца гэтым пытаньнем. А між тым гэта вельмі цікавае пытаньне. Што такое процанты прыросту прадукцыі і што, уласна, крыецца за кожным процантам прыросту? Возьмем, напрыклад, 1925 год, пэрыяд адбудоўчы. Гадавы прырост прадукцыі быў тады 66 проц. Валавая прадукцыя прамысловасьці складала 7.700 млн. руб. 66 проц. прыросту складала тады ў абсалютных лічбах 3 мільярды з лішкам. Стала быць, кожны процант прыросту раўняўся тады 43 мільёнам рублёў. Возьмем цяпер 1928 год. Ён даў 26 проц. прыросту, гэта значыць амаль у тры разы менш у процантных адносінах, чым 1925 год. Валавая прадукцыя прамысловасьці складала тады 15.500 мільёнаў рублёў. Увесь прырост на год склаў у абсалютных лічбах 3.280 мільёнаў рублёў. Стала быць, кожны процант прыросту раўняўся тады 120 млн. руб., г. зн. складаў амаль у тры разы большую суму, чым у 1925 годзе, калі мы мелі 66 проц. прыросту. Возьмем, нарэшце, 1931 год. Ён даў 22 проц. прыросту, г. зн. у тры разы менш, чым у 1925 годзе. Валавая прадукцыя прамысловасьці складала тады 30.600 млн. руб. Увесь прырост даў у абсалютных лічбах 5.600 млн. з лішкам. Стала быць, кожны процант прыросту склаў звыш 250 млн. руб., г. зн. у шэсьць раз больш, чым у 1925 годзе, калі мы мелі 66 проц. прыросту і ў два разы больш, чым у 1928 годзе, калі мы мелі 26 з лішкам процантаў прыросту.

Аб чым усё гэта сьведчыць? Аб тым, што пры вывучэньні тэмпаў прыросту прадукцыі нельга абмяжоўвацца разглядам адной толькі агульнай сумы процантаў прыросту, трэба яшчэ ведаць, што хаваецца за кожным процантам прыросту і якая агульная сума гадавога прыросту прадукцыі. Мы бярэм, напрыклад, для 1933 году 16 проц. прыросту, г. зн. у чатыры разы менш, чым у 1925 годзе. Але гэта яшчэ ня значыць, што прырост прадукцыі за гэты год будзе таксама ў чатыры разы менш. Прырост прадукцыі ў 1925 годзе ў абсалютных лічбах склаў 3 млрд. з лішкам, а кожны процант раўняўся 43 млн. руб. Няма падстаў сумнявацца ў тым, што прырост прадукцыі ў 1933 годзе ў абсалютных лічбах пры норме 16 проц. прыросту складзе ня менш 5 млрд. рублёў, г. зн. амаль у два разы больш, чым у 1925 годзе. А кожны процант прыросту будзе раўняцца, прынамсі, 320-340 млн. руб., г. зн. будзе складаць, прынамсі, у 7 раз большую суму, чым кожны процант прыросту ў 1925 годзе.

Вось як абарочваецца справа, таварышы, калі разглядаць пытаньне аб тэмпах і процантах прыросту канкрэтна.

Так стаіць справа з выкананьнем пяцігодкі за чатыры гады ў галіне прамысловасьці.

IV. Вынікі пяцігодкі за чатыры гады ў галіне сельскай гаспадаркі

Пяройдзем да пытаньня аб выніках пяцігодкі за чатыры гады ў галіне сельскай гаспадаркі.

Пяцігодка ў галіне сельскай гаспадаркі ёсьць пяцігодка калектывізацыі. З чаго выходзіла партыя, праводзячы калектывізацыю? Партыя выходзіла з таго, што для ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту і па буйовы сацыялістычнага грамадзтва, апрача індустрыялізацыі, неабходзен яшчэ пераход ад дробнай індывідуальнай сялянскай гаспадаркі да буйной, калектыўнай сельскай гаспадаркі, забясьпечанай трактарамі і сучаснымі сельска-гаспадарчымі машынамі, як адзіна моцнай асновы савецкай улады на вёсцы.

Партыя выходзіла з таго, што без калектывізацыі нельга вывесьці нашу краіну на шырокую дарогу пабудовы эканамічнага фундаманту сацыялізму, ня кажучы ня выбяжыць шматмільённае працоўнае сялянства ад галечы і нішчуства.

Ленін гаварыў, што «дробным гаспадаркам з галечы ня выйсьці» (Ленін, 3-е выд., т. XXIV, стар. 540).

Ленін гаварыў, што «калі мы будзем сядзець па-старому на дробных гаспадарках, хоць і вольнымі грамадзянамі на вольнай зямлі, нам усё роўна пагражае неминучая пагібель» (Ленін, 3-е выд., т. XX, стар. 417).

Ленін гаварыў, што «толькі пры дапамозе агульнай, арцельнай, таварыскай працы можна выйсьці з таго тупіку, у які загнала нас імпэрыялістская вайна» (Ленін, 3-е выд., т. XXIV, стар. 537).

Ленін гаварыў, што «необходна пазбавіцьці да агульнай апрацоўкі ў буйных узорных гаспадарках; бяз гэтага выйсьці з тэй разрухі, з таго проста такі расстрэл дзікага становішча, у якім знаходзіцца Расія, нельга» (Ленін, 3-е выд., т. XX, стар. 418).

Выходзячы з гэтага Ленін прыйшоў да наступнага асноўнага вывару:

«Толькі ў тым выпадку, калі ўласна на справе паказаць сялянам перавагі грамадзкай, калектыўнай, таварыскай, арцельнай апрацоўкі зямлі, толькі калі ўласна дапамагчы селяніну пры дапамозе таварыскай арцельнай гаспадаркі, тады толькі рабочая класа, якая трымае ў сваіх руках дзяржаўную ўладу, сапраўды дакажа селяніну сваю правату, сапраўды прыцягне на свой бок моцна і сапраўдным чынам шматмільённую сялянскую масу» (Ленін, 3-е выд., т. XXIV, стар. 579-580).

З гэтых палажэньняў Леніна выходзіла партыя, праводзячы праграму калектывізацыі сельскай гаспадаркі, праграму пяцігодкі ў галіне сельскай гаспадаркі.

У сувязі з гэтым задача пяцігодкі па сельскай гаспадарцы заключалася ў тым, каб аб'яднаць разрозненыя і дробныя індывідуальныя сялянскія гаспадаркі, пазбаўленыя магчымасьці скарыстаць трактары і сучасныя сельска-гаспадарчыя машыны,—у буйныя калектыўныя гаспадаркі, узброеныя ўсімі сучаснымі прыладамі высокапрадукцыйнай сельскай гаспадаркі, а свабодныя землі пакрыць узорнымі дзяржаўнымі гаспадаркамі, саўгасамі.

Задача пяцігодкі па сельскай гаспадарцы заключалася ў тым, каб ператварыць СССР з краіны дробна-сялянскай і адсталай у краіну буйнай сельскай гаспадаркі, якая арганізавана на базе калектыўнай працы і дае найбольшую таварнасьць. Чаго дабілася партыя, праводзячы праграму пяцігодкі за чатыры гады ў галіне сельскай гаспадаркі? Выканала яна гэту праграму ці пацярпела крах?

Партыя дабілася таго, што на працягу якіх-небудзь трох год яна здолела арганізаваць больш 200.000 калектыўных гаспадарак і каля 5.000 саўгасаў збожжавага і жывёлагадоўчага напрамку, дабіўшыся адначасова пашырэньня пасэўных плошчаў за чатыры гады на 21 млн. гектараў. Партыя дабілася таго, што калгасы яшчэ цяпер звыш 60 проц. сялянскіх гаспадарак з ахопам звыш 70 проц. усіх сялянскіх плошчаў, што азначае **перавыкананьне пяцігодкі ў тры разы.**

Партыя дабілася таго, што замест 500-600 млн. пудоў таварнага збожжа, якое загатаўлялася ў пэрыяд пераважаньня індывідуальнай сялянскай гаспадаркі, яна мае цяпер магчымасьць загатаўляць 1.200 1.400 млн. пудоў збожжа штогод.

Партыя дабілася таго, што кулацтва як класа разгромлена, хоць і недабіта яшчэ, працоўнае сялянства вызвалена ад кулацкай кабалы і эксплёатацыі і пад савецкую ўладу падведзена моцная эканамічная база ў вёсцы, база калектыўнай гаспадаркі. Партыя дабілася таго, што СССР ператвораны ўжо з краіны дробнай сялянскай гаспадаркі ў краіну самай буйнай сельскай гаспадаркі ў сьвеце.

Такія ў агульным выніку пяцігодкі за чатыры гады ў галіне сельскай гаспадаркі.

Мяркуйце цяпер самі: чаго варта пасьля ўсяго гэтага балбатня буржуазнай прэсы аб «краху» калектывізацыі, аб «праваале» пяцігодкі ў галіне сельскай гаспадаркі.

А як стаіць справа з сельскай гаспадаркай у **капіталістычных** краінах, якія перажываюць зараз жорсткі сельска-гаспадарчы крызіс?

Вось усім вядомыя афіцыяльныя даныя: Скарочаны пасэўныя плошчы ў асноўных збожжавытвараючых краінах на 8-10 проц., скарочаны пасэўныя плошчы па бавоўне ў ПАЗШ на 15 проц., па цукровых буракох у Германіі і Чэха-Славакіі—на 22-30 проц., па ільну ў Літве і Латвіі—на 25-30 проц.

Паводле даных амэрыканскага сельска-гаспадарчага дэпартаманту кошт валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў ПАЗШ знізіўся з 11 млрд. даляраў у 1929 г. да 5 млрд. у 1932 г., г. зн. больш чым на 50 проц. Па збожжы там-жа кошт валавой прадукцыі знізіўся з 1.288 млн. даляраў у 1929 г. да 391 млн. даляраў у 1932 г., г. зн. больш чым на 68 проц. Па бавоўне там-жа зьніжэньне з 1.389 млн. даляраў у 1929 г. да 397 млн. даляраў у 1932 г., г. зн. зьніжэньне больш чым на 70 проц. Ці-ж не гавораць усе гэтыя факты аб перавагах савецкай сыстэмы сельскай гаспадаркі перад сыстэмай капіталістычнай? Ці-ж не гавораць гэтыя факты аб тым, што калгасы зьяўляюцца больш жыцьцяздольнай формай гаспадаркі, чым аднаасобныя і капіталістычныя гаспадаркі?

Гавораць, што калгасы і саўгасы ня зусім рэнтабельны, што яны паглынаюць безьліч сродкаў, што трымаць такія прадпрыемствы няма ніякага рэзону, што больш мэтазгодным было-б распусьціць іх, пакінуўшы толькі рэнтабельныя з іх. Але так могуць гаварыць толькі людзі, якія нічога не разумеюць у пытаньнях народнай гаспадаркі, у пытаньнях эканомікі. Больш паловы тэкстыльных прадпрыемстваў некалькі год таму назад былі нерэнтабельнымі. Адна частка нашых таварышоў прапаноўвала нам тады закрыць гэтыя прадпрыемствы. Што было-б з намі, калі-б мы паслухалі іх? Мы зрабілі-б найвялікшае злачынства перад краінай, перад рабочай клясай, бо мы разбурылі-б гэтым нашу ўзрастаючую прамысловасьць. Як-жа мы паступілі тады? Мы пачакалі год з лішкам і дабіліся таго, што ўся тэкстыльная прамысловасьць стала рэнтабельнай. А наш аўтазавод у г. Горкім? Таксама-ж нерэнтабельны пакуль што. Ці не загадаеце закрыць яго? Або наша чорная металюргія, якая таксама пакуль што нерэнтабельная? Ці не закрыць яе, таварышы? Калі так гляджэць на рэнтабельнасьць, дык мы павінны былі-б разьвіваць ва ўсю толькі некаторыя галіны прамысловасьці, якія даюць найбольшую рэнту, напрыклад—канцыгэрскую прамысловасьць, мукамольную прамысловасьць, парфумэрную, трыкатажную, прамысловасьць дзіцячых цацак і т. д. Я, зразумела, ня супроць разьвіцьця гэтых галін прамысловасьці, наадварот, яны павінны быць разьвіты, бо яны таксама патрэбны для насельніцтва. Але, па-першае, яны ня могуць быць разьвіты без абсталяваньня і аналу, якія дае ім цяжкая індустрыя. Па-другое, на іх немагчыма базіраваць індустрыялізацыю. Вось у чым справа, таварышы. На рэнтабельнасьць нельга глядзець па-ганцілярску, з пункту погляду данай мінуты. Рэнтабельнасьць трэба браць з пункту гледжаньня апульна-народнай гаспадаркі ў разрэзе некалькіх год. Толькі такі пункт гледжаньня можа быць названы сапраўды ленінскім, сапраўды марксыцкім. І гэты пункт гледжаньня абавязковы не толькі ў адносінах да прамысловасьці, але яшчэ ў большай ступені ў адносінах да калгасаў і саўгасаў. Вы толькі падумайце: за якія-небудзь пры гады мы стварылі больш 200.000 калгасаў і каля 5 тыс. саўгасаў, г. зн. мы стварылі зусім новыя буйныя прадпрыемствы, якія маюць такое-ж значэньне для сельскай гаспадаркі, як заводы і фабрыкі для прамысловасьці. Назавеце краіну, якая здолела-б стварыць на працягу трох год ня 205 тыс. новых буйных прадпрыемстваў, а хоць-бы 25.000 такіх прадпрыемстваў. Вы не назавеце, бо няма і ня бывала такой краіны. А мы стварылі 205 тыс. новых прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы. І вось ёсьць, аказваецца, на сьвеце людзі, якія патрабуюць, каб гэтыя прадпрыемствы сталі адразу рэнтабельнымі, а калі яны ня стануць адразу рэнтабельнымі, то зруйнаваць і распусьціць іх. Ці ня ясна, што лаўры Герастрата не даюць спаць гэтым больш чым дзіўным людзям? Гаворачы аб нерэнтабельнасьці калгасаў і саўгасаў, я зусім не хачу сказаць, што яны ўсе нерэнтабельныя. Нічога падобнага. Усім вядома, што ўжо цяпер ёсьць цэлы рад высока-рэнтабельных калгасаў і саўгасаў. У нас ёсьць тысячы калгасаў і дзесяткі саўгасаў зусім рэнтабельных ужо цяпер. Гэтыя калгасы і саўгасы зьяўляюцца гонарам нашай партыі, гонарам савецкай улады. Калгасы і саўгасы, зразумела, ня ўсюды адноўкавыя. Сярод калгасаў і саўгасаў ёсьць старыя, новыя і зусім малодыя. Гэта яшчэ слабыя, ня зусім адлітыя гаспадарчыя арганізмы. Яны перажываюць у сваім арганізацыйным будаўніцтве прыблізна той-жа пэрыяд, які перажывалі нашы заводы і фабрыкі ў 1920-21 г. г. Зразумела, што яны ня могуць быць яшчэ рэнтабельнымі ў сваёй большасьці. Але што яны стануць рэнтабельнымі на працягу 2-3 год таксама, як сталі рэнтабельнымі нашы фабрыкі і заводы пасьля 1921 г., у гэтым ня можа быць ніякага сумненьня. Адмовіць ім у дапамозе і падтрыманьні на тэй падставе, што ня ўсе яны рэнтабельныя ў даную мінуту, — значыць зрабіць найвялікшае злачынства перад рабочай клясай і сялянствам. Толькі ворагі народу і контр-рэвалюцыянэры могуць ставіць пытаньне аб непатрэбнасьці калгасаў і саўгасаў.

Ажыцьцяўляючы пяцігодку па сельскай гаспадарцы, партыя праводзіла калектывізацыю паскоранымі тэмпамі. Ці правільна зрабіла партыя, праводзячы палітыку паскораных тэмпаў калектывізацыі? Так, бязумоўна правільна, хоць і не абышлася тут справа без некаторых захапленьняў. Праводзячы палітыку ліквідацыі кулацтва як класы і выкарчоўваючы кулацкія гнёзды, партыя не магла спыніцца на паўдарозе, яна павінна была давесьці да канца гэту справу. Гэта, па-першае. Па-другое, маючы ў сваім распараджэньні трактары, сельгасмашыны, з аднаго боку, і карыстаючыся адсутнасьцю прыватнай уласнасьці на зямлю (нацыяналізацыя зямлі), з другога боку, партыя мела ўсе магчымасьці фарсаваць калектывізацыю сельскай гаспадаркі. І яна сапраўды дабілася ў гэтай галіне найвялікшага поспеху, бо перавыканала праграму пяцігодкі па калектывізацыі ў тры разы. Ці значыць гэта, што мы павінны праводзіць палітыку фарсаваных тэмпаў калектывізацыі і ў пэрыяд другой пяцігодкі? Не, ня значыць. Справа ў тым, што мы ўжо **закончылі** ў асноўным калектывізацыю асноўных раёнаў СССР. Сталі быць, зрабілі больш у гэтай галіне, чым можна было чакаць. І ня толькі скончылі ў асноўным калектывізацыю. Мы дабіліся таго, што ва ўсьведамленьні вясьнарнай большасьці сялянства калгасы сталі найбольш ужытнай формай гаспадаркі. Гэта вялізарнае заваяваньне, таварышы. Цяпер пытаньне стаіць ужо не аб тым — быць ці ня быць калгасам, — гэта пытаньне ўжо вырашана станоўча. Калгасы замацаваны і шлях да старой аднаасобнай гаспадаркі закрыт канчаткова. Цяпер задача заключаецца ў тым, каб умацаваць калгасы арганізацыйна, вынішчыць адтуль шкодніцкія элемэнты, падабраць сапраўдныя праверныя бальшавіцкія кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды бальшавіцкімі. У гэтым цяпер галоўнае. Так стаіць справа з пяцігодкай за чатыры гады ў галіне сельскай гаспадаркі.

V. Вынікі пяцігод

ВЫНІКІ ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДКІ

Даклад тав. СТАЛІНА на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) 7-га студзеня 1933 году

таму назад мы мелі каля паўтара мільёнаў беспрацоўных. Вось ужо два гады, як зьнішчылі мы беспрацоўе. І рабочыя пасьпелі ўжо забыць за гэты час аб беспрацоўі, аб яго гнёце, аб яго жудасьцях. Паглядзеце на капіталістычныя краіны, якія жудасьці твораць там на глебе беспрацоўя. У гэтых краінах ёсьць цяпер ня менш 30-40 мільёнаў беспрацоўных. Што гэта за людзі? Аб іх звычайна гавораць, што гэта «кончаныя людзі». Яны кожны дзень дамагаюцца работы, шукаюць работы, гатовы прыняць амаль любыя ўмовы работы, але іх ня прымаюць на работу, бо яны «лішнія» людзі. І гэта ў той час, калі вялізарныя масы тавараў і прадуктаў кідаюцца на вецер дзеля капрызаў пястуноў лёсу, сынкоў капіталістаў і памешчыкаў. Беспрацоўным адмаўляюць у харчох таму, што ім няма чым плаціць за прадукты, ім адмаўляюць у кватэры таму, што ім няма чым плаціць за яе.

Чым і дзе яны жывуць? Яны жывуць жабрачымі падачкамі з панскага стала, раскопваньнем сьметнікаў, дзе яны знаходзяць выдыя рэшткі ежы, жывуць у трушчобах вялікіх гарадоў, а больш за ўсё ў хібарках за горадам, насьпех пабудаваных беспрацоўнымі з дошак ад скрынь і драўлянай кары. Але гэта ня ўсё. Ад беспрацоўя церпяць ня толькі беспрацоўныя. Ад яго церпяць таксама і рабочыя, якія яшчэ маюць работу. Церпяць, бо вялікая колькасьць беспрацоўных стварае для іх няўстойлівае становішча на вытворчасьці, няпэўнасьць у заўтрашнім дні. Сёньня яны працуюць па прадпрыемстве, але яны ня ўпэўнены, што, прачнуўшыся, заўтра не даведаюцца, што яны ўжо разьлічаны.

Адно з асноўных заваяваньняў пяцігодкі за чатыры гады заключаецца ў тым, што мы зьнішчылі беспрацоўе і пазбавілі рабочых СССР ад яго жудасьцяй.

Тое-ж самае трэба сказаць пра сялян. Яны таксама забылі аб распластаваньні сялян на кулакоў і беднякоў, аб эксплёатацыі беднаты з боку кулакоў, аб руйнаваньні, якое кожны год пускала па сьвету сотні тысяч і мільёны беднаты. Гадоў 3-4 таму назад у нас мелася беднякоў сярод сялян ня менш 30 проц. усяго сялянскага насельніцтва. Гэта складала больш дзесятка мільёнаў людзей. А яшчэ раней, да Кастрычніцкай рэвалюцыі, беднякі складалі ня менш 60 проц. сялянскага насельніцтва. Што такое беднякі? Гэта такія людзі, у якіх звычайна не хапала для гаспадаркі або насеньня, або каня, або прылад, або не хапала ўсіх гэтых рэчаў разам узятых. Беднякі гэта такія людзі, якія жылі ўпрогаладзь і, як правіла, знаходзіліся ў кабале ў кулакоў, а ў старыя часы і ў кулакоў, і ў памешчыкаў. Яшчэ зусім нядаўна каля паўтара мільёна, а то і цэлых два мільёны беднякоў вакіроўвалася штогод на заработкі на Поўдзень, на Паўночны Каўказ і Украіну ў наймёты да кулакоў, а яшчэ раней да кулакоў і памешчыкаў. Яшчэ больш прыходзіла іх штогод да заводзкіх брам, запаўняючы рады беспрацоўных. І ня толькі беднякі знаходзіліся ў такім незавідным становішчы. Добрая палова серадняковай знаходзілася ў такой-жа галечы і няхватках, як і беднякі. Пра ўсё гэта пасьпелі ўжо забыць сяляне.

Што дала пяцігодка за чатыры гады беднякам і ніжэйшым пластом серадняковай? Яна падарвала і разьбіла кулацтва як клясу, вызваліўшы беднякоў і добрую палову серадняковай ад кулацкай кабалы. Яна ўцягнула іх у калгасы і стварыла для іх моцнае становішча. Яна зьнішчыла тым самым магчымасьць распластаваньня сялянства на эксплёататараў, кулакоў і эксплёатуемых беднякоў. Яна ўзьняла беднату і ніжэйшыя пласты серадняковай у калгасах на становішча людзей забясьпечаных, зьнішчыўшы тым самым працэс руйнаваньня і зьбядненьня сялянства. Цяпер ужо няма ў нас такіх выпадкаў, каб мільёны сялян зрываліся штогод са сваіх месц і ішлі на заработкі ў далёкія краі.

Для таго, каб выцягнуць селяніна на работу, куды-нібудзь за яго ўласны калгас, цяпер трэба падпісаць дагавор з калгасам, ды яшчэ забясьпечыць калгасніку дарогу праезд па чыгунцы. Цяпер ужо няма ў нас такіх выпадкаў, каб сотні тысяч і мільёны сялян руйнаваліся і абівалі порогі фабрык і заводаў. Гэта справа была, але яна ўжо даўно сплыла. Цяпер сялянін забясьпечаны ўласным калгасам, член калгасу, які мае ў сваім распараджэньні трактары, сельгаспашыны, насенныя фонды, запасныя фонды і г. д. і інш.

У результаце гэтых асноўных заваяваньняў у галіне паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочых і сялян, мы маем за першую пяцігодку:

а) рост колькасьці рабочых і служачых буйной прамысловасьці ў два разы ў параўнаньні з 1928 годам, што дае перавыкананьне пяцігадовага плану на 57 проц.;

б) рост народнага даходу, стала быць, рост даходаў рабочых і сялян, які дасягнуў у 1932 годзе 45.1 млрд. рублёў, што дае павялічэньне па 85 проц. у параўнаньні з 1928 годам;

в) рост сярэдня-гадавой заработнай платы рабочых і служачых буйной прамысловасьці на 67 проц. у параўнаньні з 1928 годам, што дае перавыкананьне пяцігодкі на 18 проц.;

г) рост фонду сацыяльнага страхаваньня на 292 проц. у параўнаньні з 1928 годам (4.120 млн. руб. у 1932 годзе супроць 1.050 млн. руб. у 1928 годзе), што дае перавыкананьне пяцігадовага плану на 111 проц.;

д) рост грамадзкага харчаваньня з ахопам звыш 70 проц. рабочых рашаючых галін прамысловасьці, што дае перавыкананьне пяцігодкі ў шэсьць раз.

Зразумела, мы яшчэ не дабіліся таго, каб поўнасьцю забясьпечыць матар'яльныя патрабаваньні рабочых і сялян. І наўрад ці мы даб'емся гэтага ў бліжэйшыя гады. Але мы бязумоўна дабіліся таго, што матар'яльнае становішча рабочых і сялян паляпшаецца ў нас з году ў год. У гэтым могуць сумняваца хіба толькі заклятыя ворагі савецкай улады, або быць можа некаторыя прадстаўнікі буржуазнага друку, у тым ліку і адна частка карэспандэнтаў гэтага друку ў Маскве, якія разумеюць у эканоміцы народаў і ў становішчы працоўных паўрад ці больш, чым, скажам, абісінскі король ў вышэйшай матэматыцы.

А як стаіць справа са становішчам рабочых і сялян у капіталістычных краінах?

Вось афіцыяльныя даныя:

Катастрафічна ўзрасла колькасьць беспрацоўных у капіталістычных краінах. У ПАЗШ, паводле афіцыяльных даных, па адной толькі апрацоўчай прамысловасьці колькасьць занятых рабочых зьменшылася з 8,5 млн. чал. у 1928 годзе да 5,5 млн. у 1932 годзе. Паводле даных-жа амэрыканскай фэдэрацыі працы, колькасьць беспрацоўных у ПАЗШ ва ўсёй прамысловасьці даходзіць у канцы 1932 году да 11 млн. чалавек. У Англіі колькасьць беспрацоўных, паводле даных афіцыяльнай статыстыкі, узрасла з 1.290 тыс. у 1928 годзе да 2,8 млн. чалавек у 1932 годзе. У Германіі, паводле афіцыяльных даных, колькасьць беспрацоўных узрасла з 1.376 тыс. у 1928 г. да 5,5 мільёна ў 1932 г.

Такі-ж малюнак назіраецца ва ўсіх капіталістычных краінах, прычым афіцыяльная статыстыка, як правіла, перауменшае даныя аб беспрацоўных, колькасьць якіх хіба ці ў капіталістычных краінах ад 35 да 40 мільёнаў чалавек.

Сыстэматычна праводзіцца зьніжэньне заработнай платы рабочых. Паводле афіцыяльных даных, зьніжэньне сярэдня-месячнай зарплаты ў ПАЗШ дасягнула 35 проц. у параўнаньні з узроўнем 1928 г. У Англіі за той-жа тэрмін — 15 проц., а ў Германіі — нават 50 проц. Паводле падлікаў амэрыканскай фэдэрацыі працы, страты амэрыканскіх рабочых у результаце зьніжэньня зарплаты ў 1930-31 г. склалі больш 35 мільёнаў даляраў.

Значна скарочаны і без таго нязначныя фонды страхаваньня рабочых у Англіі і Германіі. У ПАЗШ і ва Францыі зусім адсутнічае або амаль адсутнічаюць якія-б там ні было формы страхаваньня беспрацоўных, з прычыны чаго надзвычай расьце лік бяздомных рабочых і бяспрытульных дзяцей, асабліва ў ПАЗШ.

Ня лепш стаіць справа са становішчам сялянскіх мас у капіталістычных краінах, дзе сельска-гаспадарчы крызіс у корані падрывае сялянскую гаспадарку і пускае мільёны зруйнаваных сялян і фермэраў па сьвету.

Такавы вынікі пяцігодкі за чатыры гады ў галіне паляпшэньня матар'яльнага становішча працоўных СССР.

VI. Вынікі пяцігодкі за чатыры гады ў галіне таваразвароту паміж горадам і вёскай

Пяройдзем цяпер да пытаньня аб выніках пяцігодкі за чатыры гады ў галіне росту таваразвароту паміж горадам і вёскай. Вялізарны рост прадукцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, рост тавараных лішкаў як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы, нарэшце, рост патрэбнасьцяй рабочых і сялян — усё гэта не магло ня прывесьці і сапраўды прывяло да ажыўленьня і пашырэньня таваразвароту паміж горадам і вёскай.

Вытворчая змычка паміж горадам і вёскай ёсьць асноўная форма змычкі. Але адной толькі вытворчай змычкі мала. Яе трэба дапоўніць змычкай таварнай для таго, каб сувязь паміж горадам і вёскай стала моцнай і непарыўнай. Гэтага можна дабіцца толькі праз разгортваньне калгаснага гандлю. Было-б няправільна думаць, што савецкі гандаль можна разгарнуць праз які-небудзь адзін канал, напрыклад, праз каапэрацыю. Для разгортваньня савецкага гандлю неабходна выкарыстаць усе каналы — і каапэрацыйную сетку, і дзяржаўна-гандлёвую сетку, і калгасны гандаль. Некаторыя таварышы думаюць, што разгортваньне савецкага гандлю, асабліва-ж разгортваньне калгаснага гандлю, ёсьць зварот да першай стадыі нэпу. Гэта зусім няправільна. Паміж савецкім гандлем, у тым ліку калгасным гандлем, і гандлем першай стадыі нэпу існуе карэнная розьніца. На першай стадыі нэпу мы дапускалі ажыўленьне капіталізму, дапускалі прыватны таваразварот, дапускалі «дзейнасьць» прыватных гандляроў, капіталістаў, спэкулянтаў. Гэта быў больш ці менш свабодны гандаль, абмежаваны толькі рэгулюючай роляй дзяржавы. Тады прыватна-капіталістычны сэктар у таваразвароце краіны займаў досыць вялікае месца. Я ўжо не гавару аб тым, што тады ня было ў нас такой разьвітай прамысловасьці, як цяпер, ні калгасаў, ні саўгасаў, працуючых па пляну і даючых у распараджэньне дзяржавы вялізарныя рэзервы сельгаспрадуктаў і гарадзкіх вырабаў.

Ці можна сказаць, што мы зараз маем такое-ж становішча?

Зразумела, нельга гэтага сказаць.

Па-першае, савецкі гандаль нельга ставіць на адну дошку з гандлем на першай стадыі нэпу, які хаця-б рэгуляваўся дзяржавай. Калі гандаль на першай стадыі нэпу дапускаў ажыўленьне капіталізму і функцыянаваньне прыватна-капіталістычнага сэктару ў таваразвароце, то савецкі гандаль выходзіць з адмаўленьня як таго, так і другога. Што такое савецкі гандаль? Савецкі гандаль ёсьць гандаль без капіталістаў — малых і вялікіх, гандаль без спэкулянтаў — малых і вялікіх. Гэта асобнага роду гандаль, якога ня ведала да гэтага часу гісторыя і які практыкуем толькі мы, бальшавікі, ва ўмовах савецкага разьвіцьця

Па-другое, мы маем цяпер досыць разьвітую дзяржаўную прамысловасьць і цэлую сыстэму калгасаў і саўгасаў, якія забясьпечваюць дзяржаве вялізарныя рэзервы сельска-гаспадарчых і прамысловых тавараў для развароту савецкага гандлю. Гэтага ня было і не магло быць ва ўмовах першай стадыі нэпу.

Па-трэцяе, мы дабіліся таго, што за апошні нэрыяд вышыбілі зусім з таваразвароту прыватных гандляроў, кущоў, пасярэднікаў усякага роду.

Зразумела, гэта не выключае таго, што могуць зноў зьявіцца ў таваразвароце па закону атавізму прыватныя гандляры і спэкулянты, скарыстоўваючы для гэтага найбольш зручнае для іх поле, а іменна — калгасны гандаль. Больш таго, самі калгасьнікі іншы раз не ад таго, каб пусьціцца ў спэкуляцыю, што не зьяўляецца для іх, зразумела, гонарам. Але супроць гэтых нездаровых зьяўішч у нас ёсьць пяцёўка выданы закон савецкай улады аб мерах перасячэньня спэкуляцый і пакараньня спэкулянтаў. Вы ведаеце, зразумела, што закон гэты не асабліва мяккі. Вы зразумееце, рэдома, што такога закону ня было і не магло быць ва ўмовах першай стадыі нэпу.

Вы бачыце, што габарыць пасьля ўсяго гэтага аб звароце да гандлю першай стадыі нэпу — значыць нічога, роўна нічога не разумець у нашай савецкай эканоміцы.

Нам гавораць, што немагчыма разгарнуць гандаль, калі нават ён зьяўляецца савецкім гандлем, без здаровай грашовай гаспадаркі і здаровай валюты, што трэба перш за ўсё лічыць грашовую гаспадарку і нашу савецкую валюту, якая нібы не прадстаўляе ніякай каштоўнасьці. Так гавораць пам эканамісты капіталістычных краін. Я думаю, што гэтыя паважаныя эканамісты разумеюць у палітычнай эканоміі ня больш, чым, скажам, кентэрбэрыйскі біскуп у антырэлігійнай прапагандзе.

Як можна сьцьвярджаць, што наша савецкая валюта не прадстаўляе ніякай каштоўнасьці? Ці-ж гэта ня факт, што на гэту валюту мы будавалі Магнітабуд, Дняпрабуд, Кузьнецкбуд, Сталінградзкі і Харкаўскі трактарныя заводы, Горкаўскі і Маскоўскі аўтамабільныя заводы, сотні тысяч калгасаў і тысячы саўгасаў? Ці ня думаюць гэтыя паны, што ўсе гэтыя прадпрыемствы пабудаваны з саломы або з гліны, а не з сапраўдных матар'ялаў, якія маюць поўную каштоўнасьць? Чым забясьпечваецца ўстойлівасьць савецкай валюты, калі мець на ўвазе, зразумела, арганізаваны рынак, які мае рашаючае значэньне ў таваразвароце краіны, а ня рынак неарганізаваны, які мае толькі падпарадкаванае значэньне? Зразумела, ня толькі залатым запасам. Устойлівасьць савецкай валюты забясьпечваецца перш за ўсё вялізарнай колькасьцю тавараных мас у руках дзяржавы, што пускаюцца ў таваразварот па ўстойлівых цэнах. Хто з эканамістаў можа адмаўляць, што такое забясьпячэньне, якое мае месца толькі ў СССР, зьяўляецца больш рэальным забясьпячэньнем устойлівасьці валюты, чым любы залаты запас? Ці зразумеюць калі-небудзь эканамісты капіталістычных краін, што яны канчаткова заблыталіся з тэорыяй залатога запасу, як адзінага забясьпячэньня ўстойлівасьці валюты?

Так стаіць справа з пытаньнямі, зьвязанымі з разгортваньнем у савецкім гандлі.

Чаго дабіліся мы ў результаце правядзеньня пяцігодкі ў галіне разгортваньня савецкага гандлю?

У результаце пяцігодкі мы маем:

а) павялічэньне працэнтнай лёгкай прамысловасьці, якая падвялася да 18 проц. у параўнаньні з 1928 годам;

б) рост раздробнага каапэрацыйна-дзяржаўнага таваразвароту, які складае зараз у цэнах 1932 г. 39,6 млрд. рублёў, г. зн. павялічэньне таварнай масы ў раздробным гандлі да 175 проц. у параўнаньні з 1928 годам;

в) рост дзяржаўна-каапэрацыйнай гандлёвай сеткі на 158 тыс. крам і магазынаў у адносінах да 1929 г.;

г) усё ўзрастаючае разгортваньне калгаснага гандлю і сельска-гаспадарчых заготовак, паасобных дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый.

Такавы факты.

Зусім іншы малюнак прадстаўляе становішча таваразвароту ўнутры капіталістычных краін, дзе крызіс прывёў да катастрафічнага скарачэньня гандлю, масавага закрыцьця прадпрыемстваў і зруйнаваньня дробных і сярэдніх гандляроў, банкрутства буйных гандлёвых фірм і затаварваньня гандлёвых прадпрыемстваў пры далейшым бязупынным зьніжэньні пакупной здольнасьці працоўных мас.

Такавы вынікі пяцігодкі за чатыры гады ў галіне разьвіцьця таваразвароту.

VII. Вынікі пяцігодкі за чатыры гады ў галіне барацьбы з рэшткамі варожых клясаў

У выніку ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў галіне прамысловасьці сельскай гаспадаркі і гандлю мы ўмацавалі ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі прынцып сацыялізму, вытраўшы адтуль капіталістычныя элемэнты.

Да чаго гэта павінна было прывесьці ў адносінах капіталістычных элемэнтаў і да чаго яно на самой справе прыйшло?

Гэта прывяло да таго, што аказаліся вышыбленымі з калгаснага апошнія рэшткі паміраючых клясаў: прамыслоўцы і іх лёкаі, гандляры і іх прысьпешнікі, былыя дваране і паны, кулакі і пажулачнікі, былыя белыя афіцэры і вуразнікі, былыя паліцэйскія і жандары, усякага роду буржуазныя інтэлігенты шавіністычнага толку і ўсе іншыя антысавецкія элемэнты.

Будучы вышыбленымі з калгаснага і раскідаўшыся па ўсім СССР, гэтыя былыя людзі распаўзьліся на нашых заводах і фабрыках, на нашых установах і гандлёвых арганізацыях, па прадпрыемствах чыгуначнага і водзнага транспарту і галоўным чынам — на калгасах і саўгасах.

Распаўзьлася і схаваліся яны там, накінуўшы маску «рабочых» і «сялят», прычым сёй-той з іх пралез нават у партыю. З чым яны прышлі туды? Зразумела, з пачуцьцём нянавісьці да савецкай улады, з пачуцьцём лютай варожасьці да новых форм гаспадаркі, быту, культуры.

Пайсьці ў простую атаку супроць савецкай улады гэтыя паны ўжо ня ў сілах. Яны і іх клясы некалькі раз вялі ўжо такія атакі, але былі разьбіты і расьсеяны. Таму адзінае, што застаецца ім рабіць,—гэта пасьпрыяць і шкодзіць рабочым, калгасьнікам, савецкай уладзе, партыі. І яны пасьпрыяць, як толькі могуць, дзейнічаючы ціхай сапай. Падпальваюць склады і ломяць машыны, арганізуюць сабатаж, арганізуюць шкодніцтва ў калгасах і саўгасах, прычым некаторыя з іх, у ліку якіх ёсьць і стэпя-такія прафэсары, у сваім шкодніцтве парыве дахо дзяць да таго, што прышчапляюць жывёле ў калгасах і саўгасах чуму, сібірскую язву, сапсейнічаюць пашыранасьць мангіліту сярод коняй і г. д. Але галоўнае ня ў гэтым. Галоўнае ў «дзейнасьці» гэтых былых людзей заключаецца ў тым, што яны арганізуюць масавае распаўсюджваньне дэструкцыйнай маемасьці, каапэрацыйнай маемасьці, калгаснай уласнасьці. Зладзейства і раскрадваньне на фабрыках і заводах, зладзейства і раскрадваньне чыгуначных грузаў, зладзейства і раскрадваньне ў складах і гандлёвых прадпрыемствах асабліва зладзейства і раскрадваньне ў саўгасах і калгасах—такава асноўная форма «дзейнасьці» гэтых былых людзей. Яны адпомсьцілі б клясавым інстынктам, што асноўай савецкай гаспадаркі зьяўляецца грамадзкая ўласнасьць, што іменна гэту аснову трэба расхістаць, каб напакодзіць савецкай уладзе,—і яны сапраўды стараюцца расхістаць грамадзкую ўласнасьць шляхам арганізацыі масавага раскрадваньня.

Для арганізацыі раскрадваньняў яны выкарыстоўваюць прыватна-ўласніцкія навыкі і перажыткі калгасьнікаў, учарайшых адпасобнікаў, а цяпер членаў калгасаў. Вы, як марксісты, павінны ведаць, што сьвядомасьць людзей адстае ў сваім разьвіцьці ад фактычнага іх становішча. Калгасьнікі па становішчы ўжо не адпасобнікі, а калектывісты, але сьвядомасьць у іх пакуль што яшчэ старая, прыватна-ўласніцкая. І вось былыя людзі з раўзу эксплёататарскіх клясаў скарыстоўваюць прыватна-ўласніцкія прыхільнікі калгасьнікаў, каб арганізаваць раскрадваньне грамадзкай маемасьці і тым падхіснуць аснову савецкага ладу, грамадзкую ўласнасьць. Многія нашы таварышы добрадушна глядзяць на падобныя зьявішчы, не разумеючы сэнсу і значэньня фактаў масавага зладзейства і раскрадваньня. Яны, як сьляпыя, праходзяць міма гэтых фактаў, мяркуючы, што «тут нічога няма асабліва». Але яны, гэтыя таварышы, глыбока памыляюцца.

Асновай нашага ладу зьяўляецца грамадзкая ўласнасьць таксама, як асновай капіталізму—уласнасьць прыватная. Калі капіталісты абвяшчалі прыватную ўласнасьць сьвяшчанай і недатыкальнай, дабіўшыся ў свой час умацаваньня капіталістычнага ладу, дык мы, камуністы, тым больш павінны абвяшчаць грамадзкую ўласнасьць сьвяшчанай і недатыкальнай, коб замацаваць тым самым новы сацыялістычны формы гаспадаркі ва ўсіх галінах вытворчасьці і гандлю. Дапускаць пакражы і раскрадваньне грамадзкай уласнасьці, —усё роўна ці справа ідзе аб уласнасьці дзяржаўнай, ці ўласнасьці каапэрацыйнай і калгаснай, і праходзіць міма падобных контр-рэвалюцыйных агітнасьцяй, — значыць спрыяць падрыву савецкага ладу, які апіраецца на грамадзкую ўласнасьць, як на сваю базу. З гэтага выходзіў наш савецкі ўрад, калі ён выдаў пяцёўка закон аб ахове грамадзкай уласнасьці. Гэты закон ёсьць аснова рэвалюцыйнай законнасьці ў цяперашні момант. А неабходнасьць найстражэйшага правядзеньня яго ў жыцьцё зьяўляецца першым абавязкам кожнага камуніста, кожнага рабочага і калгасьніка. Кажуць, што рэвалюцыйная законнасьць нашых часоў нічым не адрозьніваецца ад рэвалюцыйнай законнасьці першага пэрыяду нэпу, што рэвалюцыйная законнасьць нашых часоў ёсьць зварот да рэвалюцыйнай законнасьці першага пэрыяду нэпу. Гэта зусім няверна. Рэвалюцыйная законнасьць першага пэрыяду нэпу накіроўвалася сваім лёзам галоўным чынам супроць крайнасьцяй ваеннага камунізму, супроць «незаконных» канфіскацый і пабораў. Яна гарантавала прыватнаму гаспадару-капіталісту захаваньне яго маемасьці пры ўмове самага строгага захаваньня ім савецкіх законаў. Зусім інакш стаіць справа з рэвалюцыйнай законнасьцю ў нашы часы. Рэвалюцыйная законнасьць нашых часоў накіравана сваім лёзам супроць зладзеяў і шкоднікаў, супроць хуліганаў і раскрадальнікаў грамадзкай уласнасьці. Асноўны клопат рэвалюцыйнай законнасьці ў нашы часы заключаецца ў ахове грамадзкай уласнасьці, а ня ў чым-небудзь іншым. Вось чаму барацьба за ахову грамадзкай уласнасьці, барацьба ўсімі мерамі і ўсімі сродкамі, якія прадастаўляюцца ў нашы распараджэньне законамі савецкай улады,—абумоўлена адной з асноўных задач партыі. Моцная і магутная дыктатура пралетарыяту—вось што нам патрэбна цяпер для таго, каб разьвесьць упушчэнт апошнія рэшткі паміраючых клясаў і разьбіць іх зладзейскія махінацыі.

Некаторыя таварышы зразумелі гэтак аб зьнішчэньні клясаў, аб стварэньні бясклясавага грамадзтва і адпраўдзіраваны дзяржавы, як апраўданьне ліпоты і «благадушнага», апраўданьне контр-рэвалюцыйнай тэорыі патуханьня клясавай барацьбы і аслаблень ня дзяржаўнай улады. Няма чаго і казаць, што такія людзі ня могуць мець нічога агульнага з нашай партыяй. Гэта перараджэнцы, або дэструктыўкі, якіх трэба гнаць вон з партыі. Зьнішчэньне клясаў дасягаецца ня шляхам патуханьня клясавай барацьбы, а шляхам яе ўзмацненьня. Асцярэньне дзяржавы прыводзе не праз аслабленьне дзяржаўнай улады, а праз яе максымальнае ўзмацненьне, неабходнае для таго, каб дабіць рэшткі паміраючых клясаў і арганізаваць абарону супроць капіталістычнага акружэньня, якое далёка яшчэ ня зьнішчана і ня хутка яшчэ будзе зьнішчана.

У результаце ажыцьцяўленьня пяцігодкі мы дабіліся таго, што вышыбілі канчаткова апошнія рэшткі варожых клясаў з іх вытворных пазыцый, разграмілі кулацтва і падрыхтавалі глебу для яго зьнішчэньня. Такі вынік пяцігодкі ў галіне барацьбы з апошнімі атрадамі буржуазіі.

Але гэтага мала. Задача заключаецца ў тым, каб выпыбіць гэтых былых людзей з нашых-жа ўласных прадпрыемстваў і ўстаноў і канчаткова іх абяшкодзіць. Нель гэ сказаць, каб гэтыя былыя людзі маглі што-небудзь зьмяніць сваімі шкодніцкімі і зладзейскімі махінацыямі ў пяперашнім становішчы СССР. Яны занадта слабыя і нямочныя для таго, каб процістаяць мерапрыемствам савецкай улады. Але калі нашы таварышы ня ўзброяцца рэвалюцыйнай пільнасьцю і ня выганяць з практыкі абывацельска-спакойныя адносіны да фактаў раскрадваньня грамадзкай уласнасьці, то былыя людзі могуць нарабіць ня мала брыдот.

Трэба мець на ўвазе, што рост магутнасьці савецкай дзяржавы будзе ўзмацняць супраціўленьне апошніх рэшткаў варожых клясаў. Іменна таму, што яны памираюць і адчуваюць апошнія дні, яны будуць пераходзіць ад адных форм паскоку да другіх, больш рэзкіх форм паскоку, аплюючы да адсталых пластоў насельніцтва і мабілізуючы іх супроць савецкай улады. Нямала та кой брыдоты і паклёпу, якіх-бы гэтыя былыя людзі не ўзьвялі на савецкую ўладу і вакол якіх не папрабавалі-б мабілізаваць адсталыя элемэнты. На гэтай глебе могуць жыць і заварушыцца разьбітыя групы старых контр-рэвалюцыйных партый эсэраў, меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў цэнтру і аёраін, могуць аджыць і заварушыцца асколкі контр-рэвалюцыйных апазыцыйных элемэнтаў з трацкістаў і правых ухілістаў. Гэта, зразумела, ня страшна. Але ўсё гэта трэба мець на ўвазе, калі мы хочам пакончыць з гэтымі элемэнтамі хутка і без асабліва вых ахвяр. Вось чаму рэвалюцыйная пільнасьць зьяўляецца тэй самай якасьцю, якая асабліва неабходна цяпер бальшавікам.

VIII. Агульныя вывады

Такавы асноўныя вынікі правядзеньня ў жыцьцё пяцігадовага плану ў галіне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, у галіне паляпшэньня быту працоўных і разьвіцьця таваразвароту, у галіне ўмацаваньня савецкай улады і разгортваньня клясавай барацьбы супроць рэштак і перажыткаў аджываючых клясаў.

Такавы посьпехі і заваяваньні савецкай улады за апошнія чатыры гады. Было-б памылковым думаць на падставе гэтых посьпехаў, што ўсё абстаіць у нас добра. Зразумела, у нас ня ўсё яшчэ абстаіць добра. Недахопаў і памылак у нашай рабоце ёсьць даволі. Бесгаспадарчасьць і бесталкоўшчына ўсё яшчэ маюць месца ў нашай практыцы. Я, на жаль, не магу зараз спыніцца на недахопах і памылках, бо рамкі даручанага мне падагульваючага дакладу не даюць для гэтага прастору. Але справа цяпер ня ў гэтым. Справа ў тым, што, ня гледзячы на недахопы і памылкі, назіраныя якіх ніхто з нас не адмаўляе, мы дабіліся такіх сур'ёзных посьпехаў, якія выклікаюць захапленьне ў рабочай клясы ўсяго сьвету. Мы дабіліся такой перамогі, якая мае сапраўды сусьветна-гістарычнае значэньне.

Што магло адыграць і што сапраўды адыграла галоўную ролю ў тым, што, ня гледзячы на памылкі і недахопы, партыя дабілася ўсё-ж рашаючых посьпехаў у справе правядзеньня пяцігодкі за чатыры гады? Дзе тыя асноўныя сілы, якія забясьпечылі нам гэту гістарычную перамогу, ня гледзячы на па што?

Гэта перш за ўсё актыўнасьць і самаахвяр насьць, энтузіязм і імпэтыва мільённых мас рабочых і калгасьнікаў, якія разьвіты разам з інжынэрна-тэхнічнымі сіламі вялізарную энэргію па разгортваньні сацыялістычнага спабоніцтва і ўдарніцтва. Ня можа быць сумненьня, што без гэтай акалічнасьці мы не маглі-б дабіцца моты, не маглі-б рушыцца наперад ні на крок.

Гэта, па-другое, цьвёрдае кіраўніцтва партыі і ўраду, якія заклікалі масы наперад і перамагалі ўсе і ўсялякія труднасьці на шляху да моты.

Гэта, нарэшце, асобныя вартасьці і перавагі савецкай сыстэмы гаспадаркі, якая тоўць у сябе вялізарныя магчымасьці, не абходныя для перамаганьня ўсіх і ўсялякіх труднасьцяй.

Такавы тры асноўныя сілы, выхаваныя гістарычную перамогу СССР.

Агульныя вывады:

1. Вынікі пяцігодкі перакулілі цьверджаньне буржуазных і сацыял-дэмакратычных дзеячоў аб тым, што пяцігадовы план ёсьць фантазія, бзід, неажыцьцёўная мара. Вынікі пяцігодкі паказалі, што пяцігадовы план ўсё ажыцьцёўлен.

2. Вынікі пяцігодкі разьбілі вымоны буржуазны «сьмабаль веры» аб тым, што рабочая кляса ніздольна будаваць новае, што яна здольна толькі разбурыць старое. Вынікі пяцігодкі паказалі, што рабочая кляса здольна таксама добра будаваць новае, як і разбураць старое.

3. Вынікі пяцігодкі разьбілі тэзіс сацыял-дэмакратаў аб тым, што немагчыма пабудаваць сацыялізм у адной асобна ўзятай краіне. Вынікі пяцігодкі паказалі, што зусім магчыма пабудаваць у адной краіне сацыялістычнае грамадзтва, бо эканамічны фундамант такога грамадзтва пабудаваны ўжо ў СССР.

4. Вынікі пяцігодкі перакулілі цьверджаньне буржуазных эканамістаў аб тым, што капіталістычная сыстэма гаспадаркі зьяўляецца найлепшай сыстэмай, што ўсякая іншая сыстэма гаспадаркі памочная і ніздольная вытрымаць экзамэн перад тварам труднасьцяй эканамічнага разьвіцьця.

Вынікі пяцігодкі паказалі, што капіталістычная сыстэма гаспадаркі напрытоўная і памочная, што яна ўжо аджывае свой век і павінна ўступіць сваё месца другой вышэйшай савецкай сацыялістычнай сыстэме гаспадаркі, што адзіная сыстэма гаспадаркі якая не баіцца крызісаў і здольна перамагчы труднасьці, невыратальныя для капіталізму, — гэта савецкая сыстэма гаспадаркі.

5. Нарэшце, вынікі пяцігодкі паказалі што партыя непераможна, калі яна ведае куды весьці спрэзу і не баіцца труднасьцяй **(Бурныя, працяжныя аплёдысманты, які пераходзяць у авацыю. Заля, стоячы вітае тав. СТАЛІНА).**

Ільназагатоўкі

Патрэбна сапраўдны пералом

ТАЛАЧЫНО. Аб'яднаны пленум РК і РКК, які нядаўна адкрыўся, цэнтральную ўвагу зьвярнуў на апрацоўку і загатоўку ільну. На гэтым важнейшым вучастку талачынская арганізацыя мае вялікі прарыў.

Баявая работа па ільназагатоўках яшчэ не разгорнута. Пастанова СНК БССР аб забароне хатняга прадзіва ільну ў вёсках, сельсаветах і раёнах, занесеных на чорную дошку, яшчэ не знайшла свайго практычнага праламленьня ў Талачынскім раёне. Зусім слаба ажыцьцяўляюцца рэпрэсіўныя меры ў адносінах злосных зрыўшчыкаў ільназагатовак.

Можна прывесьці вялікую колькасьць прыкладаў, якія сьведчаць аб яўнай недаацэнцы **ільназагатовак.**

У калгасе імя 13-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі плян загатовак ільну яшчэ ня выкананы, між тым вялікая колькасьць ільну ўжо разьмеркавана паміж калгасьнікамі і нават паміж членамі калгасу. У калгасе «Н. Сарнаўка», Друцкага сельсавету, пад «непасрэдным кіраўніцтвам» старшыні калгасу, кандыдата партыі **Бараноўскага,** звыш 100 пудоў лепшага ільнавалак на раздана калгасьнікам, а дзяржаве замест 57 цэнт. здана толькі 9 цэнт.

Ва многіх сельсаветах кругласутачная работа мяльна-суцільных пунктаў не арганізавана, яны працуюць усяго толькі па 4-6 гадзін. Раённыя і сельскія арганізацыі ня здолелі спалучыць загатоўкі ільну са збожжазагатоўкамі. Узорныя прыклады барацьбы за збожжа не перанесены ў шматдзённую работу па ільназагатоўках.

У часе правядзеньня збожжазагатовак выяўлена вялікая засьмечанасьць антысавецкімі элемэнтамі раду сельсаветаў, калгасаў і партыйных ячэек.

Старшыня Мархлеўскага сельсавету, член партыі, **Матусевіч** за чарку гарэлкі вызваляў ад цьвёрдых заданьняў кулацка-заможныя гаспадаркі і давоўіў непасільныя пляны да бядняцкіх дваро ў.

Старшыня Алёнаўскага сельсавету **Кандыба,** сакратар парт'ячэйкі **Курыпа** і старшыня сельскажыгвартства **Бузо** самавольна зьменшылі на 50 проц. цьвёрдыя заданьні кулацка заможным гаспадаркам.

Сакратар парт'ячэйкі Скуратаўскага сельсавету—**Бэйнэр** замест актыўнага ўдзелу ў збожжазагатоўках займаўся самаснабжэньнем, разбазараў калгаснае збожжа. Бэйнэр загадаў старшыні цаўленьна калгасу «Бурнаўка» **Грамакоўскаму** вывазіць яму збожжа, якое ён потым пацінькіму перапраўляў у Магілеў. Жыў Бэйнэр у замоскіка, які «чамусьці» вызвалеп ад збожжазагатовак.

— Амаль няма такога калгасу ў раёне, які-б ня быў засьмечан антысавецкімі элемэнтамі,—заявіў на пленуме сакратар райкому тав. **Славін.**

Вось некалькі характэрных прыкладаў. Цьвёрдазаданьнік Карбоўскі, які да рэвалюцыі меў 35 га зямлі, зараз пралез у калгас «Авангард» і дабіўся зьніцьця цьвёрдага заданьня. У калгас імя Будзённага пралез кулак **Фэдарцоў,** які да рэвалюцыі меў 120 га зямлі. Ён зараз актыўна займаецца разбурэньнем калгасу.

Патураньне кулацтву праявіў Талачынскі парсуд. Судзьдзя Ігнатаў «з-за адсутнас

Загатаўляць ня менш 9.000 тон бульбы ў дзень!

Засталося толькі 6 дзён

Партыя і ўрад устанавілі ў якасьці шюшняга тэрміну скончэньня бульбазагатовак—**15-га студзеня.** Толькі шэсьць дзён засталіся да канца загатовак. Між тым да 8-га студзеня загатоўлена **87,1 проц.** Тэм ны загатовак надзвычай нізкія—ня больш 0,5-0,6 проц. у дзень. Толькі дзень 7 студзеня даў некаторы прырост—да 2,5 проц.

Калі надалей мы будзем працаваць такімі чарапашымі тэмпамі, загатоўкі бульбы зацягнуцца і заданьне партыі і ўраду будзе сарвана.

Засталося адгрузіць 54 тыс. тон. Гэта колькасьць можа быць загатоўлена ў бліжэйшыя дні, калі мы будзем адгружаць штодзенна ня менш 9 тыс. тон, або 2—2,5 проц. Толькі такая баявая работа забясьпечыць перамогу на фронце загатовак.

Ёсьць усе ўмовы для пасьпяховага скончэньня кампаніі. Аб гэтым сьведчыць вопыт 13 перадавых раёнаў, якія перавыканалі пляны. Аб гэтым гаворыць той факт, што плян загатовак складае ня больш 4-5 проц. ураджаю, прычым ён на 220 тыс. тон менш летаняшняга.

Калі мы дагэтуль ня справіліся з уклад зенымі на нас абавязкамі па снабжэньні бульбай рабочых цэнтраў і прамысловасьці, дык толькі таму, што многія раённыя арганізацыі зусім закінулі гэты вучастак работы. Яны лічылі, што раз раён рапартаваў аб скончэньні адгрузкі Ленінграду, дык можна адпачыць, можна бульбай больш не займацца. Яны зусім забыліся пра тое, што плян адгрузкі Ленінграду складае толькі 45 проц. агульнага загатоўчага пляну, што рабочыя цэнтры БССР поўнасьцю не забясьпечаны асноўным прадуктам харчаваньня—бульбай, што іх абавязак—забясьпечыць сырцом крохмальную і броварную прамысловасьць БССР.

Загатоўчыя сыстэмы таксама падзаліся дэмабілізацыйным настроям. Белплодгароднінны на дагэтуль не наладзіла дакладнага і своя часовага ўліку ходу загатовак, не наладзіла выразнага апэрацыйнага кіраўніцтва райканторамі. У аграце Белплодгароднінны ня ведаюць, як працуе таго ці іншая кантора. Оршанская раённая кантора, выканаўшы свой плян загатовак на 60,2 проц., за апошнія пяць дзён не загатовіла ні аднаго кілёграму бульбы. Бялыніцкая раённая кантора замест таго, каб арганізаваць прыём бульбы на месцы, заключыць дагавары з калгасамі на вывазку, распаладзілася чакусьці прымаць бульбу ня ў Бялынічах, а Магілеве, тармозячы гэтым загатоўкі.

Ёсьць раёны, якія злачынна зрываюць загатоўкі. Возьмем **Прапойскі** раён. Ён павінен здаць 4.600 тон. Загатоўлена-ж ім 2.425 тон або 52,7 проц. Раённыя арганізацыі бязьдзейнічаюць, ня прымаюць ніякіх мер да ўзмацненьня загатовак, а кулацка-заможныя элемэнты і іх агенты, якія пралезьлі ў калгасныя сельсаветы і калгасы, разбазарваюць бульбу, хаваюць яе, сабатуюць выкананьне цьвёрдых заданьняў.

Кармянскі раён павінен здаць 6 тыс. тон, загатовіў-жа ён 3.067, або 51,1 проц.

Жлобінскі—адзін з рашаючых бульбяных раёнаў БССР—атрымаў заданьне ў 10.000 тон. Загатоўлена-ж ім 6.582, або 65,8 проц.

Пятрыкоўскаму раёну дан плян у 4.000 тон, здана ім 2.450—61,3 проц.

Такую работу нельга інакш кваліфікаваць, як **злосным ігнараваньнем дырэктыў партыі, як сабатажам загатовак.**

ЦК КП(б)Б пастанавіў занесьці на чорную дошку за дрэнную работу па загатоўках бульбы Прапойскі раён у цэлым, а таксама сакратара РК **Іванова,** старшыню РВК **Лязоненку,** і ўпаўнаважанага ЦК **Шындлера.** Па Кармянскім раёне, які даў но ўжо фігуруе на чорнай дошцы, занесены па апошнюю сакратар РК **Саладухін,** старшыня РВК **Новікаў** і ўпаўнаважаны ЦК **Валодзька.**

ЦК КП(б)Б папярэдзіў гэтыя раёны, што калі яны не дабіўшы рашаючага пералому на працягу бліжэйшых 2—3 дзён, да іх будуць ужыты самыя суровыя меры партыйнага спагнаньня.

Адначасова атрымалі папярэджаньне Пятрыкоўскі, Жлобінскі, Веткаўскі і Чачэрскі раёны. Калі яны не дасягнуць пералому ў бліжэйшыя дні, яны таксама будуць занесены на чорную дошку.

Пастанова ЦК зьлучаецца папярэджаньнем усім адсталым раёнам. Партыя і ўрад не дапусьцяць зрыву важнейшай сельскагаспадарчай кампаніі. Партыя і ўрад ня спыняцца перад самымі рашучымі мерамі, каб прымусіць раённыя арганізацыі пабазоваму ўзяцца за работу і зламаць супраціўленьне кулацтва.

Перанёсшы выпрабаваньні мэтады збожжазагатовак на гэты вучастак загатоўчай работы, зламаўшы кулацкі сабатаж, даўшы сакрушальны адпор варожым элемэнтам і іх агентуры, раённыя арганізацыі зтолеюць да 15-га студзеня поўнасьцю выканаць плян загатовак бульбы.

Перавыканалі плян

1. ЛЕЛЬЧЫЦКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛЯН НА	114,0	проц.
2. АСЬВЕЙСКІ	— 112,0	»
3. НАРАЎЛЯНСКІ	— 107,6	»
4. АСІПОВІЦКІ	— 107,3	»
5. ТУРАЎСКІ	— 106,7	»
6. МЕНСКІ	— 103,8	»
7. РАСОНСКІ	— 103,5	»
8. ПЛЕШЧАНІЦКІ	— 102,1	»
9. КАМАРЫНСКІ	— 101,7	»
10. ЖЫТКАВІЦКІ	— 100,3	»
11. ДРЫСЕНСКІ	— 100,0	»
12. ШКЛОЎСКІ	— 100,0	»
13. ГОМЕЛЬСКІ	— 100,0	»

Адсталі

1. Бешанковіцкі	— 74,2	проц.
2. Дзяржынскі	— 73,4	»
3. Сеножскі	— 73,2	»
4. Глускі	— 73,1	»
5. Веткаўскі	— 71,6	»
6. Крычаўскі	— 69,7	»
7. Чэрыкаўскі	— 69,3	»
8. Вузьвенскі	— 69,3	»
9. Рэчыцкі	— 66,6	»
10. Жлобінскі	— 65,8	»
11. Ельскі	— 65,1	»
12. Пятрокоўскі	— 51,3	»
13. Лоеўскі	— 56,6	»
14. Прапойскі	— 52,7	»
15. Кармянскі	— 51,1	»

За зрыў бульбазагатовак занесены на чорную дошку

1. Сакратар Кармянскага РК КП(б)Б—САЛАДУХІН
2. Старшыня Кармянскага РВК—НОВІКАЎ
3. Упаўнаважаны ЦК па Кармянскім раёне—ВАЛОДЗЬКА
4. Сакратар Прапойскага РК КП(б)Б—ІВАНОЎ
5. Старшыня Прапойскага РВК—ЛЯВОНЕНКА
6. Упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Прапойскім раёне—ШЫНДЛЕР

ЗАГАТОЎКІ БУЛЬБЫ ПА БССР

(у процентах да гадавога пляну)

На 5 студзеня	На 6 студзеня	На 7 студзеня	На 8 студзеня
83,7	84,0	84,6	87,1

Узяць прыклад з перадавікоў

КЛІМАВІЧЫ. Гадавы плян бульбазагатовак выканан па раёну на 7 студзеня па 97,1 проц. Перадавыя сельсаветы (Асмоловіцкі і Судзілаўскі), спалучыўшы ўдарнае правядзеньне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній, перавыканалі свае пляны па загатоўках бульбы і поўнасьцю спагналі цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак.

Зусім інакш выглядаецца на тых сельсаветах, дзе лібэральнічаюць з кулаком, дзе адсутнічае бальшавіцкая барацьба за бульбу. Напрыклад, Малашкавіцкі, Г.-Міскі, Пуцімельскі і Цімашаўскі сельсаветы пляны здачы бульбы па аднаасобным сэктары выканалі толькі на 11-20 проц.

Клясавы вораг у гэтых сельсаветах не атрымлівае належнага адпору. Кулакі і заможнікі (Захараў, Пятроў, Піцакаў і інш.) вядуць агітацыю сярод адсталых калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на зрыў загатовак. У гэтых кулакоў знойдзена па 1.000—1.500 пудоў захаванай бульбы.

Забялычанскі сельсавет яшчэ 25 сьнежня рапартаваў РК і РВК аб поўным выкананьні пляну па ўсіх культурах і сэктарох, за што пастановай РВК быў прэміраваны. Між тым зараз выявілася, што гэты «рапарт» зьявіўся простым ашуканствам. Сельсавет і па сёньняшні дзень яшчэ ня выканаў загатоўчых плянаў.

Райснаб ня ведае, як ідзе спагнаньне бульбы з кулацка-заможных гаспадарак. (БЕЛТА).

Дапамагаюць кулаком хаваць бульбу

ПРАПОЙСК. У **Рабавіцкім** сельсавеце загатоўкі бульбы праходзяць ва ўмовах прыміраючых адносін да кулацкага сабатажу. Калі брыгада актыву знайшла шмат кулацкай бульбы і збожжа захаваных у калгаснікі **Кубрачэнкі,** дык трыкутнік сельсавету прыняваў Кубрачэнку здаць толькі 5 пудоў збожжа, матывуючы гэта тым, што захаваная працуючыя належыць калгаснікам. Між тым паступіў рад заяў аб тым, што Кубрачэнка хавае кулацкую маемасьць.

Брыгада студэнтаў ВКСГПБ атрымала ад калгаснікаў немалы залп аб тым, што рахункавод сельсавету **Касьцючэнка Алесь** хавае кулацкае збожжа і бульбу. Брыгада зьвярнулася да сельсавету з просьбай дазволіць зрабіць вобыск у Касьцючэнкі. Упаўнаважаны РК т. Мажайка адмовіў брыгадзе і адзначыў, што «заявы былі паданы яму яшчэ месяц назад і што гэта толькі рэзультат асабістых пяётак».

Пад націскам брыгады **Мажайка** даў згоду праверыць заявы. У часе вобыску брыгада выявіла захаваных 91 пуд збожжа і шмат бульбы. Ня гледзячы на гэта, сельсавет дазволіў забраць толькі 31 пуд з прычыны быццам, прадукцыя зьяўляецца ўласнасьцю сямога Касьцючэнкі.

Ульяноўскі, Шапіра.

Бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый спрыяе сабатажу

ДАГАЧОЎ. Адпаасобныя гаспадаркі **Асаўніцкага** сельсавету выканалі плян бульбазагатовак толькі на 88,4 проц. Зрываюцца загатоўкі ў вёсцы Даброцін, дзе яшчэ ня здана 31 цэнтн. бульбы.

Члены сельсавету і камсамольская ячэйка на чале з сакратаром **Карнеевым** бязьдзейнічаюць, гэтым карыстаюцца кулакі і заможнікі, якія арганізавалі сабатаж бульбазагатовак.

Цьвёрда-заданьнік **Давыдовіч** Лаўрэн та ня здаў дзяржаве яшчэ 3,2 цэнтн. бульбы. Кулацкія агенты — **Станкевіч** Праскоўя, Алесь **Цімахоў, М. Пузанькоў** агітуюць сярод аднаасобнікаў за падачу бульбы і самі хаваюць прадукцыю. Ня здаўшы дзяржаве ад 3 да 4 цэнтн. бульбы кожны.

Сераднік вёскі Сялівонаўка, Сьвяцкага сельсавету, — **Максім Маркаў** навінен быў здаць 540 клг. бульбы па самабалізацыі. Ён здаў толькі 180 клг. і падрабіў квіткі на рэшту бульбы. Кулацкі маёўр Маркава быў своечасова выкрыт сельсаветам і арт'ячэйкай. Адпак, дагэтуль сабатажнік ня прыцягнут да судовай адказнасьці.

І. М.

Кіраўніцтва Ляхаўскага сельсавету зраслося з заможнікамі

ЖЫТКАВІЧЫ. (Наш кар.). Па калгасах Рудзінскага і Людзяневіцкага сельсаветаў выяўлены факты псаваньня бульбы. Праўленьні калгасаў праявілі яўна злачынныя адносіны да захаваньня загатоўленай бульбы і дапусьцілі эксцэсныя ня грыбком. У калгасе «Беларусь», Рудзінскага сельсавету, забуртавалі вільготную бульбу, у выніку згніло кала 500 пудоў. У калгасе імя Калініна, «Новае жыцьцё» і «Завет Леніна» ва многіх буртох аказалася гнілая бульба.

РК і РКК перадалі пракуратуры справы аб старшыньях праўленьняў, якія дапусьцілі псаваньне бульбы.

Кіраўніцтва **Ляхаўскага** сельсавету, стаўшы на шлях абароны кулацтва, арганізавала зрыў загатовак. Старшыня сельсавету **Грабеньнікаў** праводзіў кулацкую лінію і дагэтуль не давёў плянаў загатовак, у прыватнасьці бульбы да калгасаў і населеных пунктаў. Пяць заможнікаў, якім прэзыдыумам сельсавету былі даны цьвёрдыя заданьні, ня ўключаны ў сьпіс цьвёрда-заданьнікаў.

Зрослыся з клясава-варожымі элемэнтамі, Грабеньнікаў ня прымаў ніякіх мер у адносінах да сабатажнікаў загатовак, п'янствуе разам з заможнікамі і дыскрэдытаваў савецкую ўладу.

Ён захаваў пад сукном акты, складзеныя камісіяй садзейнасьці на кулацка-заможныя гаспадаркі, якія ня выканалі сваіх плянаў. Затое ён атчаў пад суд 60-гадовага старога бетняка і выключыў з калгасу тры бядняцкія гаспадаркі.

Сакратар партыйнай ячэйкі — **Хільневіч** ня прыняў ніякіх мер да барацьбы з кулацкім сабатажам, не мабілізаваў на гэту справу партыйныя арганізацыі.

Паводле пастановы РК і РВК, Грабеньнікаў зьнят з пасады старшыні сельсавету і прыцягнут да судовай адказнасьці. Пастановай БК-РСІ ён выключаны з партыі. Прыцягнут да адказнасьці сакратар партячэйкі **Хільневіч.** Упаўнаважаны РВК па Ляхаўскім сельсавеце **Рымашэўскі** за патураньне кулакам і заможнікам, за зрашчваньне з варожымі элемэнтамі выключаны з партыі, зьнят з работы і прыцягнут да судовай адказнасьці.

К. Н.

Загатоўчы апарат дэмабілізаваўся

Згодна распараджэньня ўпаўнаважанага камітэту загатовак, сыстэма Белкаапшлодгароднінны павінна загатовіць дадаткова для прамысловасьці БССР 8.000 тон бульбы.

Адпак загатоўкі на сёньняшні дзень праходзяць надзвычай марудна. Фактычна на 9 студзеня загатоўлена толькі 910 тон.

Парыцкі райзагатовак, які павінен здаць 1657 тон бульбы, загатовіў усяго 100 тон, Слуцкі адпаведна 400—173, Лагойскі 663—60, Бялыніцкі замест 346—20 і інш.

З 16 раёнаў, атрымаўшых заданьні, толькі 8 прыслалі весткі аб ходзе загатовак. Такія райзагі як: Лепельскі, Чырвонаслабодзкі, Клічаўскі (5.000 тон), Бярэзінскі, Дубровенскі (загадчык Цецеркін), Любаньскі, Аршанскі, Бешанковіцкі (загадчык **Казлоў**), Быхаўскі (загадчык **Брылон**) ужо два тыдні як не прысылаюць ніякіх весткаў аб загатоўках бульбы.

Асноўная прычына адставаньня сыстэмы Белкаапшлодгароднінны заключаецца ў тым, што рад райзагаў канчаткова дэмабілізаваліся. Яны супакоіліся на тым, што быццам выканалі свае заданьні; 8.000 тон бульбы для прамысловасьці зусім выпалі з іх плянаў. Апараты ў аказобных райзагах распушчаны, прыёмачныя пункты ліквідаваны (Слуцк).

Дэмабілізаваўся таксама і цэнтральны апарат Белкаапшлодгароднінны. Вучотна-статыстычнае бюро (тав. **Ліфшыц**) не клапоціцца аб тым, каб наладзіць штодзённае атрыманьне вестак. Яно чакае, пакуль райзагі самі прышлюць іх.

Такое становішча зусім неапрымае. Тэрміны скончэньня загатовак бульбы, устаноўленыя для БКІГ, ужо даўно прапоў. Райзагі маюць усе магчымасьці для выкананьня плянаў.

8.000 тон павінны быць поўнасьцю ў бліжэйшыя дні здаены прамысловасьці.

Т.

ІНТЭРВ'Ю ЧЖАН СЮЭ-ЛЯНА ПРАДСТАЎНІКОМ ПРЭСЫ

ШАНХАЙ, 8. У інтэрв'ю з прадстаўнікамі прэсы Чжан Сюэ-лян заявіў: «На працягу доўгага часу я прытрымліваўся палітыкі мірнага вырашэньня канфлікту, выходзячы з таго, што становішча ніспрыяючае і будзе яшчэ больш ніспрыяючым у выпадку разьвіцьця падзей. Абараняць Кітай—наш найпершы абавязак. Але ня трэба забываць урокаў сусьветнай вайны—варочаць на да дзікасьці і барбарства, асаблівa пад тварам грамадзкай думкі, якая адпадушна выказваецца за мір. Гэтыя настроі прымушаюць нават японцаў выказвацца за мір».

Чжан Сюэ-лян высьмейвае японскія цвердженьні аб кітайскіх правакацыях, якія за ключаюцца ў перакідцы кітайскіх войск па кітайскай тэрыторыі. Гэта ўсё роўна,—указвае Чжан Сюэ-лян, як чалавек, якому пагражаюць «похитители», наймае целахоўцаў, а «похитители» крычаць, што іх пракаюць.

Далей Чжан Сюэ-лян указаў: «Для вызначэньня адказнасьці за шанхайгуанскі інцыдэнт няма патрэбы ў новай камісіі. Пытаньне заключаецца ў звароце Манчжурыі і Шанхайгуаня Кітаю. Калі японскія выступленьні ў Манчжурыі і Шанхайгуані асноўваюцца сапраўды на абвінавачаньнях супроць Чжан Сюэ-ляна, дык у такім выпадку вырашэньне япона-кітайскага канфлікту надзвычай спрашчаецца. Мы ўсімі мерамі будзем абараняць жыцьцё і нацыянальнае існаваньне Кітаю, ня гледзячы на тое, што японцы праўдападобна будуць пратэставаць супроць нашага намеру абараняцца. Цярпеньне Кітаю і яго ўстрыманьне ад абароны не далі належных рэзультатаў. Мірны настрой Лігі нацый і ўсяго сьвету таксама нічога не далі. Мы намераны ажыцьцявіць нашы меры, не зьвяртаючыся да вайны».

4½ ТЫСЯЧЫ НАСТАЎНІКАЎ У ПОЛЬШЧЫ ВЫКІНУТЫ НА ВУЛІЦУ ЗА АДЗІН ГОД

Для падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР, на ўтрыманьне вялізарнага паліцэйскага апарату для барацьбы супроць рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызвалеўчага руху ў Польшчы і на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіны фашызм патрабуе вялізарных сродкаў. А між тым, дзяржаўныя даходы з прычыны крызісу бязупынна катастрафічна зьмяншаюцца. Падатковая шруба заціснута да адказу. У працоўных мас падаткамі абкладзена ўсё, што толькі можна было абкласьці. Але і гэтага не хапае фашызму для ажыцьцяўленьня сваіх імпэрыялістычных плянаў. У мэтах адшуканьня новых сродкаў для далейшых узбраеньняў фашызм скарачае і да таго жабрачую дапамогу беспрацоўным, пэнсіі дзяржаўным служачым, мізэрную дапамогу інвалідам, удовам і сіротам. Адначасова скарачаюцца з кожным годам усё больш у значных разьмерах і выдаткі на народную асьвету.

Так, скарачэньне бюджэту на асьвету ў параўнаньні з 1929 годам адбываецца наступным чынам: калі ў 1929-30 годзе ўрадам было асыгнавана **452.688.852 зл.,** то ў 1930-31 годзе—**450.118.523 зл.,** у 1931-1932 годзе—**360.438.420 зл.,** у 1932-33 годзе—**351.813.300 зл.,** а на 1933-34 год меркуецца—**324.597.107 зл.**

Як бачым, бюджэтныя асыгнаваньні на народную асьвету ў фашысткай Польшчы ў 1933 годзе зьменшаны ў параўнаньні з бюджэтам мінулага году **больш чым на 26 млн. злотых.** На працягу-ж пяці бюджэтных год выдаткі на асьвету і культурныя патрэбы краіны, нават павоцле афіцыяльных даных, скараціліся **на 140 млн. злотых,** што на кожны год у сярэднім складае кала 30 млн. зл.

Гэтыя афіцыяльныя даныя штогодняга зьмяншэньня асыгнаваньняў на асьвету аднак не даюць яшчэ поўнага малюнку сапраўднага скарачэньня выдаткаў на асьвету ў фашысткай Польшчы. Адна справа асыгнаваньня, а другая—выкарыстоўваньне вызначанай сумы. За першыя чатыры месяцы бягучага году ўрад **недадаў 7 млн. злотых.** З гэтага можна меркаваць, што пасьля заканчэньня бюджэтнага году сапраўднае выдаткі на асьвету будуць скарочаны ўрадам на дзесяткі мільёнаў злотых.

Скарачэньне выдаткаў на асьвету адбываецца ў той час, калі павялічваюцца выдаткі на ваенныя ўзбраеньні, на ўтрыманьне паліцыі, кожндзоў, шпікоў і турэмнае будаўніцтва. За кошт скарачэньня жабрачай дапамогі беспрацоўным, якімі шпаркімі тэмпамі ідзе заняпад асьветы працоўных мас паказвае наступны факт. Калі ў 1931-32 годзе было ў Польшчы **звыш 71 тыс. настаўнікаў,** дык зараз засталося **66.500.** Як бачым, **толькі за адзін год 4½ тыс. настаўнікаў** зволены з працы.

Паводле афіцыяльных даных лік дзяцей школьнага ўзросту, якія не наведваюць школу, **складае 300 тыс.** (у сапраўднасьці-ж кала мільёну). Зразумела, што па-за школамі засталіся дзеці рабочых і працоўнага сялянства. З прычыны скарачэньня выдаткаў на асьвету значна зьменшылася колькасьць і самых школ. Зараз на аднаго настаўніка прыпадае больш 65 дзяцей. Зразумела, што аб нармальным навучаньні дзяцей ня можа быць і сутаркі.

Каб закрыць доступ дзецям працоўных у сярэднія школы, урадам у бягучым навучальным годзе выдан новы школьны закон. На падставе гэтага закону **ва ўсіх сярэдніх школах л'кв'даваны першыя клясы.** Такім чынам, каб папасьці ў гімназію, або ў іншую сярэднюю школу, дзеці працоўных павінны пакласьці шмат сілы і затраціць шмат сродкаў на падрыхтоўку, наймаючы прыватным парадкам настаўнікаў.

Аб навучаньні працоўных у вышэйшых навучальных установах няма чаго і гаварыць. **Дзьверы для іх наглуха зачынены.** Гэтага ня ўтойвае польская буржуазная прэса. Кракаўская фашысткая газэта **«Час»** пісала, што восеньню бягучага году на мэдычны факультэт Кракаўскага ўнівэрсытэту не падана ні адной заявы з вёскі,—г. зн. нават з боку кулацкіх дзяцей.

Але і тыя студэнты, выхадцы з рабочых і сялян, якія мелі шчасьце папасьці раней ва ўнівэрсытэт, прымушаны зараз кідаць навучаньне з прычыны **павышэньня аплаты на 80 проц.**

Зразумела, што асьвета шырокіх працоўных мас—ня ў мэтах польскага фашызму і пануючых клясаў. Для далейшага існаваньня фашысткай дыктатуры, для ажыцьцяўленьня захопніцкіх плянаў фашызму,—патрэбна паслухмянае гарматнае мяса.

С.

ГАНЕБНАЯ СТАРОНКА У ГІСТОРЫІ РУМЫНСКАЙ ЗАМЕЖНАЙ ПАЛІТЫКІ

ВЕНА, 7. У аглядзе румынскай замежнай палітыкі ў 1932 г. бухарэсцкая фашысцкая газэта **«Кувынтул»** рэзка крытыкуе паводзіны румынскай дыпляматыі ў часе савецка-румынскіх перагавораў аб пакце ненападу. «Сумная трагедыя савецка-румынскіх перагавораў аб пакце,—піша газэта,—суправаджалася дыпляматычнымі скандаламі, якія прадстаўляюць сабою ганебную старонку ў гісторыі румынскай замежнай палітыкі. Перагаворы вяліся на працягу некалькі месяцаў з нячуванай бясспрыцыпнасьцю, у надзвычай уніжальных абставінах. Яны не маглі прывесьці да іншага рэзультату, акрамя таго, да якога яны прывялі. Гэтыя дыпляматычныя перагаворы, якія павінны былі-б весьціся з найвялікшай канфідэнцыяльнасьцю, мелі сваім рэзультатам мізэрныя публічныя спрэчкі, у якіх бралі ўдзел кіраўнікі румынскай замежнай палітыкі, палітычныя лідэры парляманту, а таксама румынская і замежная прэса».

Газэта далей падрабязна апісвае ход перагавораў і прыходзіць да наступнага вываду. Будучае высьвятліць, хто меў рацыю—Тытулеску, ці Вайда Вайвода. Мы павінны, аднак, ужо зараз падагуліць нашы дыпляматычныя дзеяньні. Савецка-румынскія перагаворы выклікалі ва ўсім сьвеце дыскусію па пытаньні аб Бэсарабіі, прычым нават некаторыя колы выказаліся за плебісыт.

Заключэньне Польшай і Францыяй пакту аб ненападзе з Савецкім саюзам закранае інтарэсы саюзаў франка-румынскага і франка-польскага і, у прыватнасьці, кінула цень на румынска-польскую прыязань. З пункту гледжаньня замежнай палітыкі пагаворы аб пакце ненападу з Савецкім саюзам прынесьлі Румыніі выключнае паражэньне».

КОЖНЫ ДРУГІ РАБОЧЫ ДЭТРОЙТА — БЕСПРАЦОЎНЫ

НЮ-ЕРК, 8. Паводле паведамленьня **«Н'ю-Ёрк Таймс» у Дэтройце з 689.000 рабочых—350 000 беспрацоўных.** У штаце **Тэхас** кала **350.000 беспрацоўных.** Гэта ліча нават у ПАЗШ лічыцца надзвычайна высокай для сельска-гаспадарчага штату з насельніцтвам кала 4,5 млн. чал.

Тысячы пэграў—батракоў пазбаўлены прадметаў першай неабходнасьці і сярод іх вялікая сьмяротнасьць.

У **Люсьвілі** (штат Кэнтукі) наглядаецца рост захворваньняў сярод насельніцтва на глебе голаду. Характэрна, **што 40 проц. памершых хворых** у 18 раёнах Кэнтукі **не атрымалі ўрачэбнай дапамогі.** З найтарамільённага насельніцтва **Пітсбурга** 20.000 беспрацоўных. Тысячы іншых жыхароў, якія зарэгістраваны, як працуючыя, працуюць па сутнасьці толькі 1—2 дні на тыдзень за нязначную плату.

У асабліва цяжкім становішчы—беспрацоўныя жанчыны. У **Атлантзе** (штат Георгія) з 44.000 беспрацоўных—палова жанчыны. Наглядаецца вялізарны рост пракстытуцыі. **У Сант-Луізе** (штат Місуры) колькасьць бяздомных жанчын, якія адчуваюць патрэбу ў дапамозе, павялічылася ў 10 раз у параўнаньні з 1931 годам. Больш шасьць з іх—пажылыя з вялікім стажам работы ў мінулым.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Памяшканьне дзяржаўнага польскага тэатру імя 11 ліпеня
(Савецкая, 29, тэл. 15-20, 21612)
ЭСТРАДНЫ ТЭАТР „ДАМЗЦ"
СЕНЬНЯ ПРАГРАМА ПЕРШАГА ЦЫКЛЮ
выступаюць лепшыя артысты эстрады
В. І. Гапін, П. Я. Курзнэр, М. К. Наруйская і інш.
Пачатак: поўна ў 8 з палов. гадз. вечара.
Білеты ў рабочае з 12 да 2 і з 4 да 5 гадз. веч.
І ў касе тэатру з 5 да 10 гадз. вечара.

Інтэрнацыянал. Каса—ад 12 г. дня
Немецкі мастацкі фільм ГОРНАЯ БАЛЯДА
Звыш праграмы—Кіно-хроніка

Кіно ПРАЛЕТАРЫ
Новы мастацкі фільм 1) У ВЯЛІКІМ ГОРАДЗЕ 2) Часоп. Беларусьфільма № 15.
Пачатак сэанс для дзяцей ДУЖЫ НЕПЕРАМОЖНЫЯ

СПАРТАК. КАСА адкрыта з 1 гадз. дня
На экране Ігар Ільінскі. Калі прабуджаюцца мёртвыя
камедыя ў 6 частках.

МЕНГАРСТРАХКАСА
паведамляе,
што перарэгістрацыя страхавацелей
ПРАЦЯГНУТА да 12 студзеня,
і адначасова папярэджае, што кіраўнікі неперарэгістраваных прадпрыемстваў і ўстаноў
будуць аштрафаваны.
Менгарстрахкаса.

У аддзел аб'яў звяталіцца па тэлефону 7-81

Народны камісарыят працы БССР
СЕНЬНЯ, 10 студзеня, у 6 гадз. веч.
у памяшканьні Цэнтральнага Дому Тэхнікі (Камсамольская, 25)
скліка е
1-ШЫ ПЛЕНУМ
РЭСПУБЛІКАНСКАГА МІЖВЕДАМСТВЕННАГА САВЕТУ ПА ТЭХНІЧНЫМ НАРМАВАНЬНІ
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Аб задачах тэхнармаваньня—даклад навуковага сакратара Усесаюзнага міжнароднага савету па тэхнічным нармаваньні т. Прымака.
2) Даклад т. Сульскага аб задачах і мэтадах перабудовы тэхнічнага нармаваньня ў металёвай прамысловасьці
3) Даклад т. Манусевіча аб задачах і мэтадах перабудовы тэхнічнага нармаваньня на лесазагатоўках БССР.
4) Даклад т. Шчэглева аб стане і пэрспэктывах падрыхтоўкі кадраў патэхнічным нармаваньні.
Для прыняцьця ўдзелу ў рабоце пленуму запрашаюцца работнікі аддзелаў эканомікі працы ТНВ, нармоўшчыкі і рацыяналізатары ўсіх прадпрыемстваў, аб'яднаньняў, устаноў і ЦП саюзаў.
Бюро РМСТН.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
ІНСТЫТУТ ЭКОНОМІКІ
Навуковы камітэт па вывучэньні праблемы „ВЯЛІКАГА ДНЯПРА"
10 студзеня, ў 7 гадз. вечара,
ў агульнай залі Беларускай Акадэміі Навук (рог Ленінскай і Універсытэцкай № 29-35)
АДБУДЗЕЦЦА
публічны акадэмічны ДАКЛАД
на тэму: ПРАБЛЕМА
ВЯЛІКАГА ДНЯПРА
Дакладчыкі: Акадэмік Усеукраінскай Акадэміі Навук тав. ВОБЛЫЙ.
Сакладчыкі: Першы Віцэ-Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук праф. Т. ДОМБАЛЬ.
УВАХОД НА ДАКЛАД ПА БІЛЕТАХ.
Білеты можна атрымаць у дырэкцыі Інстытуту эканомікі і ў канцылярыі Беларускай Акадэміі Навук. Тэлефон АТС № 23-760.
ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТУ ЭКАНОМІКІ.

КІНО ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА
АД 10 СТУДЗЕНЯ
НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ,
які малюе гераічную барацьбу за вуглядзьне ар тыкай
ПЕРАМОЖЦЫ НОЧЫ
Вытворч. Ленінгр. ф-кі РОСФІЛЬМ
Кіно-рэвю ў 8 частках.
ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ
Пачатак 1-га сэансу ў 5 гадз., 2-га—6 г. 45 хв., 3-га—8 г. 30 хв., 4-га—10 г. 15 хв.
КАСА АДКРЫТА З 1 ГАДЗ. ДНЯ
Тыя, што спазьніліся, не дапускаюцца.

У Беларускаму Дзяржаўнаму Лесатэхнічнаму Інстытуту патрабуюцца навуковыя працаўнікі
па наступных спэцыяльнасьцях:
1. Электратэхніка — інжынэр з вытворчым стажам—дацэнт.
2. Цепластэхніка — інжынэр з вытворчым стажам—дацэнт.
3. Дэталі машын — інжынэр з вытворчым стажам—дацэнт.
4. Механічная апрацоўка дрэўніны — інжынэр з вытворчым стажам—дацэнт.
5. Сушка дрэўніны — інжынэр з вытворчым стажам—дацэнт.
6. Тэарыя чыг. і прыкладная механіка — інжынэр з вытворчым стажам—дацэнт.
7. Суправядзенне на-тар'ялаў — інжынэр з вытворчым стажам—дацэнт.
Аплата па згодзе.
Забясьпячэньне па катэгорыі навуковых працаўнікоў.
Прадстаўляюцца анкеты.
Заявы з вабіткамі працэнтнага спісу водзываў аб рабоце і жыцьцяпісам—падаваць да 15-1-1933 г. на адрасу: г. Гомель, Савецкая 43, Беларускаму Лесатэхнічнаму Інстытуту.
Дырэктар Інстытуту КАЛМАНОВІЧ.

Менск, друкарня «Зьвязды».
Галоўлітбел № 337.